© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 15 (2284)
21 лютага 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За вялікую работу па мастацкім перакладзе твораў беларускіх пісьменнікаў на рускую мову і прапагандзе беларускай савецкай літаратуры пісьменнік Рыленкаў Мікалай Іванавіч Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

□

За актыўную шматгадовую работу ў друку і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння загадчык рэдакцыі музычнай літаратуры выдавецтва «Беларусь», кампазітар Кузняцоў Іван Іванавіч Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

НАЗЫВАЮЦЬ ДАСТОЙНЫХ

У гарадах і вёсках рэспублікі працягваецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх і раённых Саветаў. Сярод вылучаных кандыдатаў — шмат прадстаўнікоў творчых саюзаў, тэатраў, культурна-асветных устаноў.

Беларускія кампазітары на сваім сходзе вылучылі кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета па 357 выбарчай акрузе заслужанага дзеяча мастацтваў кампазітара Пятра Пятровіча Падкавырава.

Калектыў Гомельскага абласнога драматычнага тэатра назваў кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета выконваючага абавязкі дырэктара тэатра Рэзнікава Аркадзя Аронавіча. Кандыдатам у дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета вылучаны таксама галоўны рэжысёр Гомельскай студыі тэлебачання Астраумаў Сяргей Паўлавіч.

Малады артыст абласнога тэатра Юрый Барысёнак названы кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета ў Гродна. А супрацоўнікі Віцебскіх абласных праектных майстэрняў «Белдзяржпраекта» на сваім перадвыбарчым сходзе вырашылі паслаць у гарадскі Савет архітэктара Катакіна Віктара Уладзіміравіча.

Адбыўся перадвыбарчы сход у Саюзе пісьменнікаў БССР. Пісьменнікі вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных Мінска Кулакоўскага Аляксея Мікалаевіча і Васілевіч Алену Сямёнаўну.

На сходзе Саюза мастакоў Беларусі кандыдатам у дэпутаты Ленінскага райсавета сталіцы вылучана заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Кудрэвіч Раіса Уладзіміраўна.

Акруговыя выбарчыя камісіі Мінска зарэгістравалі кандыдатамі ў дэпутаты Ленінскага раённага Савета дацэнта кафедры кампазіцыі і музыказнаўства Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Мікенкаву Маргарыту Сяргееўну і канцэртмайстра кансерваторыі Касяк Ірыну Васільеўну.

Вылучэнне народных кандыдатаў у склад мясцовых Саветаў і іх рэгістрацыя працягваецца.

АГЛЯД АРГАНІЗАЦЫЙ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»

У рэспубліцы пачаўся агляд работы пярвічных раённых і гарадскіх арганізацый таварыства «Веды», які працягнецца да красавіка будучага года. Мэта агляду — пашырыць прапаганду ленінскай тэарэтычнай спадчыны, павысіць ідэйны і навуковы ўзровень лекцый, палепшыць дзейнасць пярвічных арганізацый, галіновых секцый, праўленняў гарадскіх і раённых арганізацый таварыства.

Умовы агляду прадугледжваюць павелічэнне колькасці лекцый па ленінскай тэматыцы і па пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі; высокі ідэйны і навуковы ўзровень кожнай лекцыі,даклада або гутаркі члена таварыства; шырокае выкарыстанне разнастайных форм і метадаў прапаганды — арганізацыю ленінскіх чытанняў, цыклаў лекцый, кіналекторыяў, народных універсітэтаў, правядзенне ленінскіх урокаў, тэарэтычных канферэнцый, тэматычных вечароў, вусных часопісаў, вечароў пытанняў і адказаў, сустрэч са старымі камуністамі, ветэранамі вайны і працы і інш.

Ставіцца задача ў кожным населеным пункце, мікрараёне, у кожным працоўным калектыве, на вытворчым участку наладжваць не менш адной-дзвюх лекцый у месяц (пры гэтым лектару неабходна ўлічваць адукацыю, прафесіянальныя і ўзроставыя інтарэсы слухачоў, перад якімі ён выступае). Асаблівую ўвагу арганізацыі таварыства звяртаюць на прапаганду ведаў сярод моладзі.

Надзвычай важна ўстанавіць кантроль за якасцю лекцый, іх ідэйным узроўнем, тэматычнай накіраванасцю; максімальна выкарыстоўваць пры чытанні лекцый тэхнічныя сродкі прапаганды, наглядныя дапаможнікі і ілюстрацыйныя матэрыялы; аказваць тэарэтычную і метадычную дапамогу лектарам.

Кіруюць грамадскім аглядам прэзідыумы праўленняў рэспубліканскага таварыства «Веды», абласных, раённых і гарадскіх арганізацый.

Пярвічныя, раённыя і гарадскія арганізацыі таварыства, якія выканаюць умовы грамадскага агляду, будуць узнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі. Для пярвічных арганізацый таварыства «Веды» ўстаноўлена дзесяць першых прэмій (па 100 руб.), 15 другіх прэмій (па 75 руб.) і 20 трэціх прэмій (па 50 руб.). Для раённых і гарадскіх арганізацый: тры пешыя прэміі (па 250 руб.), пяць другіх прэмій (па 175 руб.) і дзесяць трэціх прэмій (па 100 руб.).

Бывай, армія!



Некалькі хвілін спакою.



І служыць, і танцаваць майстры.

23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

СЛУЖЫМ САВЕЦКАМУ САЮЗУ!

Я развітваюся з арміяй... Падаюдзена каманда:

— Першая шарэнга — крок наперад!

Дружна грымнулі боты аб падлогу...

— Першая шарэнга — кругом!

І вось я ідў па калідоры, паміж двух шарэнгаў тых, хто застаецца. Сярод іх мае сябры, з кім запойнач сядзеў у курылцы, забыўшыся на сон, на тое, што заўтра нялёгкі працоўны дзень, марыў аб будучым. Сярод іх і тыя, хто быў мне не па душы — розныя людзі сустракаюцца ў арміі.

Але зараз я не думаю аб гэтым. Бачу толькі гарачыя вочы і працягнутыя да мяне рукі...

— Бывайце, хлопцы... Глядзіце тут... Хутка ўжо і вам... Год праляціць — не заўважыце...

Словы нейкія недарэчныя, перасядаюць у горле, на вочы наплывае нешта гарачае, перашкаджае глядзець. Нехта абдымае мяне, сціскае—аж косці хрусцяць...

— Бывайце, хлопцы!

— Бывай, армія!

Не дзень, не два стаяў я ў тваіх шарэнгах. Жыў па тваім суровым, але разумным распарадку. Вучыўся тваім нялёгкім, але вельмі патрэбным навукам. Можа зараз, калі пакідаю цябе, я не знайду тых самых галоўных, самых справядлівых слоў, якія хачу сказаць табе. Зараз я рвуся туды, дзе чакае мяне ўжо крышку забытае і таму таямнічае жыццё. Але я ведаю, пройдзе час, і ўспаміны пра цябе стануць самымі хвалюючымі і радаснымі.

Хіба забуду альбо памяну дрэнным словам тых, хто стаяў побач у страі, хто ў цяжкі момант заўсёды гатовы быў дапамагчы, з кім дзяліўся самымі сардэчнымі тайнамі!

Хіба забуду тыя няхітрыя святы, нячастыя і, можа, таму дарагія ўдвая; танцы, калі мы, хлопцы, адтанцоўвалі без дзяўчат, няграбна перабіраючы цяжкімі ботамі; сітро, якое пілі замест віна, прысмакі, якія гатавалі нам на свята нашыя ж хлопцы!

Хіба забуду, як адцягвае плячо карабін, як нямеюць ногі пасля маршаў пад сплкотным, гарачым небам, як не дае дыхаць праціваграз, і нельга зняць яго, нельга ўдыхнуць паветра на поўныя грудзі, бо — цяжка ў навуцы, лёгка ў баі...

Не! Усё гэта застанецца ў памяці кожнага, хто насіў салдацкую гімнасцёрку, хто адчуваў надзейнае плячо таварыша і разумеў неабходнасць слова «загад».

Салдацкае жыццё, здавалася б, вельмі простае. Пад'ём, вучоба, праца, крыху вольнага часу, адбой. Але ў гэтым сціслым распарадку, у гэтай аднастайнай будзённасці заключана вялікая задача, задача выхавання з юнака мужчыны, грамадзяніна.

Перад вамі некалькі фотаздымкаў старшыны Л. Хлопава. Чалавек, які не ведае арміі, можа, гляне на іх раўнадушна. Чалавек, які ведае армію, зразумее — гэта салдацкае жыццё, падгледжанае пільным вокам аб'ектыва, тое жыццё, аб якім кожны былы салдат успамінае цёпла і радасна.

А. БЕЛАВУСАЎ.

У нас у гасцях Ян Фрэнкель.



Не забыліся рукі.

Не рэстаран. Але ж!..

УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК.

У СВЕТ АДЧЫНЕНЫ НАСЦЕЖ

Работнікі Гарадоцкай дзіцячай бібліятэкі Віцебскай вобласці зараз працуюць пад дэвізам: пазнаёміць кожнага юнага чытача з лепшымі кнігамі аб Леніне і яго паплечніках. Тут выкарыстоўваюцца ўсе формы і метады прапаганды кнігі: выстаўкі, маляўнічыя плакаты, вусныя часопісы.

Усё гэта робіцца з улікам узросту і падрыхтоўкі дзяцей. Маленькім чытачам адрасавана выстаўка «Мы аб Леніне чытаем, ленінцамі марым стаць». Другая выстаўка—«Родны, блізкі, дарагі» зроблена для вучняў старэйшых класаў.

Прапагандуюцца кнігі і з дапамогай плакатаў. Побач з плакатамі вывешваюцца водгукі юных чытачоў аб прачытаным. «Увесь вечар чытаў я гэтую кнігу і не мог адарвацца,—піша аб паэме А. Вялюгіна «Вецер з Волгі» Саша Каштанаў.—У ёй добра паказана жыццё Ульянава-хлопчыка, Ульянава-юнака... Я так захапіўся, што і не заўважыў, як скончылася кніга, і мне захацелася прачытаць яе яшчэ раз».

Цэнтрам работы па выхаванні дзяцей на прыкладах з жыцця Ільіча з'яўляецца ленінскі куток бібліятэкі. Тут аформлена кніжная выстаўка «Такім быў Ленін», стэнд «Запаветам Леніна верныя», у якім паказана, як выконваецца пяцігадовы план развіцця рэспублікі і свайго Гарадоцкага раёна.

У кутку ёсць альбомы «Ордэны Леніна на грудзях нашых землякоў», «Нашы маякі», «Героі Сацыялістычнай Працы», рапарты лепшых піянерскіх дружын аб удзеле ў экспедыцыі «Па ленінскіх запаветах». З любоўю зрабілі юныя чытачы макеты «Ленін у Разліве», «Пакой У. І. Леніна», «Рабочы кабінет У. І. Леніна ў Крамлі».

Цікавымі матэрыяламі папоўніўся ленінскі куток у апошні час. Работнікі бібліятэкі наладзілі перапіску з Ульянаўскай абласной бібліятэкай № 1 імя Леніна—яна размяшчаецца ў будынку гімназіі, дзе вучыўся Валодзя Ульянаў. Юныя чытачы з горада на Волзе прыслалі фотанарыс «Школа, дзе вучыўся Ленін», фотаальбомы «Ульянаўск — радзіма Ільіча», «Дом-музей Уладзіміра Ільіча ў Ульянаўску». Паэт Аляксандр Жараў прыслаў юным чытачам верш «Я бачыў Ільіча» і сваё фота, а лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка — кнігу «Заўсёды з намі» са сваім аўтографам.

Тут, у ленінскім кутку, ля кніжных выставак і плакатаў часта праводзяцца гутаркі, агляды кніг, сустрэчы з кавалерамі ордэна Леніна, перадавікамі сельскай гаспадаркі і прамысловасці раёна. Зрабіць ленінскія чытанні цікавымі, даходлівымі памагаюць карціны мастакоў і тэхнічныя сродкі наглядная і гукавой прапаганды: дыяфільмы, грамзапісы, магнітафон, эпідыяскоп. Разумнае спалучэнне расказу з паказам дапамагае развіваць у школьнікаў самастойнасць мыслення, уздзейнічаць на іх свядомасць і пачуцці.

У прапагандзе кніг аб Леніне бібліятэка выкарыстоўвае і другія формы масавай работы. Часта праводзяцца тут тэматычныя вечары з навуменцамі школ райцэнтра. Асабліва запомніліся юным чытачам вечары: «У. І. Ленін у беларускай народнай творчасці», «Ленін у творчасці беларускіх пісьменнікаў».

Цікава праходзяць і дзіцячыя вусныя часопісы. «Між нас жыве Ленін»—так называецца вусны часопіс, які правялі з шасцікласнікамі. Складаўся ён з чатырох старонак: «Нарадзіўся ясны сокал», «Ленін—долі каваль», «Любімы настаўнік і друг», «Жыве ў нашых сэрцах Ільіч».

Глыбокі след пакінуў у памяці юных чытачоў вечар «Ленін крочыць па Беларусі», які быў праведзены з пяцікласнікамі школы № 1. Як прайшоў гэты вечар?

...З партрэта ласкава ўсміхаецца Ільіч. Побач з партрэтам—карта Беларусі. На ёй чырвонымі сцяжкамі адзначаны гарады, праз якія праязджаў Ленін у 1900 годзе, калі ехаў у эміграцыю.

Член савета бібліятэкі П. Нарштэйн расказаў школьнікам аб мінулым Беларусі. Потым выступілі юныя чытачы. Яны расказалі, якімі сталі гарады Орша, Мінск, Баранавічы, Бяроза, Брэст, праз якія ехаў Ленін.

На вечары чыталіся вершы А. Русецкага «Ленін у Мінску», А. Астапенкі «Ён з намі заўсёды», А. Вольскага «Наш Ленін», А. Звонака «Дарагія рысы» і іншыя. З вялікай увагай слухалі ўдзельнікі вечара агляд літаратуры аб Леніне.

Ленініяна—гэта не толькі мастацкая літаратура, гэта і музыка і выяўленчае мастацтва. Для таго, каб пазнаёміць школьнікаў з творамі мастакоў, супрацоўнікі бібліятэкі ўстанавілі сувязь з Дзяржаўным мастацкім музеем. А потым адбыўся тэматычны вечар «Вобраз Леніна ў выяўленчым мастацтве». Старшакласнікі пазнаёміліся з карцінамі А. Шыбнёва «Ёсць такая партыя», «У красавіку 1917 года», з творамі А. Гугеля «Ленін сярод раненых чырвонаармейцаў», «Ленін і Крупская ў Горках», з творчасцю мастака К. Касмачова. З цікавасцю праслухалі школьнікі ўспаміны скульптара З. Азгура і мастака А. Шыбнёва аб тым, як яны працавалі над вобразам Леніна.

Надоўга запомніўся юным чытачам вечар «Ленін на сцэне і кінаэкране». Дзеці праглядзелі дыяфільмы «Ленін у Кастрычніку», «Вобраз Леніна на тэатральнай сцэне». Прыслаў пісьмо юным чытачам народны артыст рэспублікі Ф. Шмакаў, у якім ён расказаў аб Леніняне на сцэне драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

Цяпер надышла чарга сказаць, што арганізатарамі, запаўваламі ўсіх гэтых добрых спраў з'яўляюцца загадчыца бібліятэкі Вера Іосіфаўна Файн і загадчыца чытальнай залы Ганна Харытонаўна Мысліц. Гэта дзякуючы іх намаганням Гарадоцкая дзіцячая бібліятэка актыўна ўключылася ва Усесаюзны агляд бібліятэк.

Ф. НІКАЛАЕЎ.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

ПОСТ НУМАР АДЗІН

Глыбокая ноч.
Пэўна, шмат каму сніцца
Высокі пад зорамі шлях.
У цёмных лясах
Ля ракет, на граніцы
Салдаты стаяць на пастах.

Прад імі — прасторы,
Усланыя снегам,
І пікі марозных вяршынь.
А я не ў бары
І не ў стэпе пад Вегай.
Мой пост сёння —
Нумар адзін.

Сюды з каравульнага
Крочу развода,
Не проста салдат — вартавы.
На гэтым пасту,
Як жыццё і свабоду,
Вартую наш сцяг баявы.

ПЕРАД САЛДАЦКАЙ АЎДЫТОРЫЯЙ

Мінскі акруговы Дом афіцэраў праводзіць у часцях Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі тэматычныя вечары, лекцыі, кінавечары, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Цыкл, які пачат у Н-скім гарнізоне акругі, называецца «Ленін і мастацтва». У ленінскіх чытаннях актыўны ўдзел прымаюць майстры мастацтваў сталіцы рэспублікі.

З вялікай увагай слухалі воіны выступленні заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР, выканаўцы ролі У. І. Леніна ў спектаклі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР «6 ліпеня» А. Даброціна. Ён расказаў аб сваёй рабоце над вобразам правадыра рэвалюцыі.

Гэту тэму прадоўжыў у сваёй гутарцы народны мастак БССР З. Азгур. Тэма яго выступлення — вобраз Леніна ў выяўленчым мастацтве. «Ленін і музыка» — тэма лекцыі студэнткі кансерваторыі О. Грушэўскай.

Для воінаў былі выкананы любімыя вакальныя творы У. І. Леніна і славутая «Апасіяната» Бетховена, якую любіў слухаць Ільіч.

У бліжэйшы час чытанні на тэму «Ленін і мастацтва» адбудуцца і ў іншых воінскіх часцях акругі.

БЕЛТА.

У ГОД СВАЙГО ЮБІЛЕЮ

АРКЕСТР ІМЯ ОСІПАВА—У МІНСКУ

У нашу рэспубліку прыехаў праслаўлены музычны калектыў — Дзяржаўны рускі народны аркестр імя М. П. Осіпава. Пазаўчора з яго мастацтвам пазнаёміліся жыхары Салігорска, а ўчора ён пачаў канцэрты ў Мінску.

Гэты выдатны калектыў сёлета адзначае сваё пяцідзесяцігоддзе, і мінчане маюць магчымасць пераканацца, у якім росквіце творчых сіл сустракае калектыў свой слаўны юбілей.

На чале гэтага калектыву ў розныя гады стаялі вядомыя дырыжоры — Мікалай Галаванаў, Пётр Аляксееў, Мікалай Осіпаў. Для аркестра пісалі М. Іпалітаў-Іванаў, С. Васіленка, Р. Глізэр, М. Будашкін, А. Новікаў. З калектывам выступалі вядомыя савецкія вакалісты А. Пірагоў, В. Барсава, І. Казлоўскі, С. Лемешаў і многія іншыя.

З 1962 года мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам аркестра імя М. П. Осіпава становіцца заслужаны артыст БССР Віктар Дуброўскі, добра знаёмы музычнай грамадскасці нашай рэспублікі.

Аркестр імя М. П. Осіпава за апошнія гады выступаў у многіх гарадах нашай краіны і за мяжой. З яго мастацтвам пазнаёміліся ў Францыі, Заходняй Германіі, Англіі, Чэхаславакіі. У гонар свайго пяцідзесяцігоддзя калектыў аркестра падрыхтаваў новую цікавую праграму, складзеную з твораў рускай народнай і савецкай музыкі, заходнееўрапейскай класікі.

На гэты раз салістамі ў канцэртах аркестра выступаюць народны артыст СССР Дзмітрый Гнацюк і заслужаны артыст РСФСР Яўген Райкоў. Дырыжыруюць — заслужаны артыст БССР Віктар Дуброўскі і Віталій Гнутаў.

РАЗАМ З САВЕЦКІМІ БРАТАМІ

Больш за паўтара месяца прайшло з таго дня, як працоўныя нашай рэспублікі разам з усім народам краіны адзначылі слаўны юбілей—50-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі. Але ў Беларускае таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі, у творчыя саюзы яшчэ паступаюць пісьмы ад нашых суайчыннікаў, што пражываюць за мяжой, у якіх яны расказваюць пра святкаванне юбілею нашай рэспублікі.

Шматлікія паведамленні з-за рубяжа сведчаць аб тым, што 50-годдзе БССР шырока адзначаецца ў многіх краінах свету.

Галоўны рэдактар часопіса «Советский патриот», што выдаецца ў Бельгіі, Мікалай Папандапула ў сваім пісьме піша:

«Дарагія таварышы! Рэдакцыя, творчы актыў часопіса і члены Саюза савецкіх грамадзян, якія сабраліся на ўрачыстым вечар, прысвечаны 50-годдзю Савецкай Беларусі, шлюць сардэчныя пажаданні гераічнаму беларускаму народу. Вы, дарагія браты, сваімі ратнымі і працоўнымі подзвігамі здабылі нямеркнучую славу і захапленне ўсіх сумленных людзей планеты».

У студзені амаль ва ўсіх аддзелах Саюза савецкіх грамадзян Бельгіі прайшлі ўрачыстыя сходы і вечары дружбы, прысвечаныя 50-годдзю Савецкай Беларусі. На адным з вечароў клуба Цэнтральнага кіраўніцтва Саюза савецкіх грамадзян у Бруселі адбыўся конкурс дэкламатараў, якія чыталі творы беларускіх паэтаў і празаікаў. Галоўным прызам конкурсу быў сувенір «Паўлінка».

Урачыстыя сходы і вечары дружбы, прысвечаныя 50-годдзю БССР, адбыліся таксама амаль ва ўсіх аддзелах Федэрацыі рускіх канадцаў.

У Віндзоры нашы землякі святкавалі юбілей у Рускім народным доме. Вялікая зала была ўпрыгожана прыбранымі ёлкамі і гірляндамі жывых кветак. З дакладам «Залаты юбілей БССР» выступіў сакратар аддзела Федэрацыі рускіх канадцаў Міхаіл Макарэвіч. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці выканалі беларускія песні і танцы. Бурнымі апладысментамі была ўзнагароджана юная музыкантка Соня Макарэвіч, якая выканала на акардэоне песню Ю. Семянякі «Ты мне вясною прыснілася» і «Мінскі вальс» М. Шуміліна.

Асабліва цікава прайшоў вечар дружбы, прысвечаны 50-годдзю БССР, ва Украінскім рабочым доме ў Таронта, арганізаваны Федэрацыяй рускіх канадцаў горада. Зала на тры сотні месц была перапоўнена. Перад прысутнымі выступіў генеральны сакратар Федэрацыі рускіх канадцаў Рыгор Акулевіч, які расказаў аб слаўным шляху беларускага народа за 50 савецкіх гадоў. Пасля гэтага адбыўся вялікі канцэрт, у першым аддзяленні якога гучалі беларускія песні «Слуцкія ткачыхі», «Як пагнала бабуленька куранятак пасці», «Ой, бярозы ды сосны», «Ой, ляцелі гусі з броду» і іншыя. У другім аддзяленні канцэрта выконваліся песні і танцы рускіх і ўкраінскіх кампазітараў. У канцы вечара хор і танцавальная група выканалі харэаграфічную сцэнку «Бульба» ў пастаноўцы балерыны Фрыды Волкавай.

Вялікі канцэрт адбыўся 16 лютага г. г. у зале Народнага дома аддзела Федэрацыі рускіх канадцаў у Вініпегу. Тут выступаў калектыў мастацкай самадзейнасці пад кіраўніцтвам Алены Чачкоўскай.

Пачынаючы са студзеня і да гэтага часу ў залах Народных дамоў Віндзора, Таронта, Вініпега, Манрэаля, Ванкувера і іншых гарадоў Канады дэманструюцца выставкі беларускай кнігі і фотавыставкі «Беларусь за 50 савецкіх гадоў».

З пісьмаў нашых суайчыннікаў, якія жывуць у ФРГ, Галандыі, Англіі, Аргенціне і Уругваі, стала вядома, што святкаванне залатога юбілею БССР там будзе працягвацца ўвесь люты і сакавік.

П. ФРАЛОЎ,
адказны сакратар Беларускага таварыства культурных сувязей з суайчыннікамі за рубяжом.

ПАДАРУНАК МАРШАЛА

Напярэдадні Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту з Масівы ў вёску Глухі Быхаўскага раёна прыйшло адразу аж дванаццаць пасылак. І ў кожнай з іх былі кнігі. Гэты падарунак зрабіў вучням мясцовай школы іх зямляк маршал авіяцыі Герой Савецкага Саюза С. Красоўскі.

Кнігі ад маршала ў гэтую вёсну прыходзяць не ўпершыню. У шкальнай бібліятэцы ўжо ёсць 200 тамоў мастацкай літаратуры, якія падараваў С. Красоўскі школе. Сярод іх яго ўласныя творы— «Жыццё ў авіяцыі», «Савецкія лётчыкі ў баях за Радзіму» і інш.

Вось ужо некалькі гадоў С. Красоўскі падтрымлівае цесную сувязь са сваімі землякамі. Вучні ў пісьмах расказваюць яму аб сваім жыцці, поспехах у вучобе, аб тым, як яны рухтуюцца да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Цяпер навучэнцы школы выраслі створаць свой музей баявой славы, экспанаты якога раскажуць пра цінавы лёс 11 Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцаў Быхаўшчыны.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ДА ВЯРШЫНЯЎ НОВАЙ ПРАСТАТЫ

4-я сімфонія Яўгена Глебава

ГЭТЫ твор Яўгена Глебава быў паказаны ў адным з канцэртаў пленума Саюза кампазітараў БССР, прысвечанага 50-годдзю рэспублікі. Сімфонія — сур'ёзная работа музыканта, які не схільны спрашчаць задачы і не шкадуе сябе ў працы. Я хачу звярнуць на яе ўвагу чытача.

Новая сімфонія не з тых, што разлічаны на дылетанцкае «падабаецца — не падабаецца». Тут не было «пераміргвання з публікай» і кампрамісаў з уласнымі першымі творамі. Нават падрыхтаваныя слухачы былі здзіўлены, настолькі відавочны быў гэты «кідок улева». Што ж змянілася ў творчасці кампазітара?

Параўнальна з Другой сімфоніяй — многае. У той «усмешлівай» музыцы ўсё спявае і танцуе «на пуантах». Вобразы безмяцежнай радасці заключаны ў цесную аправу сумнай песні кларнета. Азёрную роўнядзь прыгожага лірызму раптам рассякае град perpetuum mobile струнных. Грозныя шумы і сухаватая маторыка знiклі гэтак жа раптоўна, як і з'явіліся. І задумлівае царства рускай кантылены працягвала жыць непаспешлівым жыццём лірычнай аповесці.

Драматычныя калізіі Трэцяй сімфоніі больш арганічныя, лірызм танчэйшы, больш разнастайныя фарбы. Паток свежых інтанацый, экспрэсіўна зместавых ладавых з'яў узбагацілі музыку Глебава. Адначасова з метадамі сімфанічнай работы ўдасканальвалася, станавілася больш вострым мастакоўскае бачанне. Потым з'явілася нешматслоўная і экстатычная «Альпійская балада» — згустак энергіі (у жанравых адносінах гэта зусім не балада, а трагедыя). Партытура балета паглыбляецца канфліктамі. Свет паралізаваны: музыка то пагружана ў дзівосныя распевы драўляных, то разарвая тканіна трапечацца, як поўная прыгажосці, экзальтацыі і прагі шчасця плоць пад націскам пакуты. Стылістычная аснова музычнай мовы кампазітара значна пашырылася, умацавалася яе тэхнічная аснашчанасць. У балеце ж стала відочным, што ў ахвяру тэхніцы развіцця прынесены «азёрны лірызм» і пластычная кантылена. Крэн у бок свабоднага ўзбагачэння гармоніі і рытму паставіў Глебава перад неабходнасцю ўскладніць інтанацыйны змест мелодыі і ў новых, значна больш цяжкіх умовах вырашаць праблемы выкарыстання фальклору. Мне не здаецца, што кампазітару ў поўнай меры ўдалося ажыццявіць гэту задачу ў «Альпійскай баладзе». Але гутарка зараз не пра яе.

Новая сімфонія не суміруе «ўчора» і «сёння». Глебаў адбірае і зноў узнаўляе. Што ж? Твор не лашчыцца да слухача мяккім аксамітам прывычных інтанацый, але паколвае зломамі рассеяных у трывожнай прасторы інтанацый-імпульсаў, азадачвае складанасцю лада-гарманічнай і поліфанічнай работы.

Спляценне вобразаў абурэння і ілюзій вылілася ў Чацвёртай сімфоніі ў напружаную лірычную драму. У імклівым мільганні блікаў сонца і ценяў, у неспакойным каларыце, у перарывістым рытме — усюды ў гэтай музыцы б'ецца жывая думка. Чалавек у свеце трывог і канфліктаў з неспакойнай думкай аб будучым — гэта тое, што зближае сімфонію Глебава па тэме з апошнімі інструментальнымі творамі яго равеснікаў — Р. Шчадрына, Б. Цішчанкі, А. Пярта, Э. Мірзаяна і інш.

У размове аб Чацвёртай сімфоніі Глебава пастаянна чуеш словы «дзіўна», «мудрагеліста», «складана». Так, гэта «сённяшні» па думках і мове твор. Ён напісаны нервова, горача і, разам з тым, як ніколі — рацыянальна. Строгая, нават акадэмічная яго форма — цыкл у чатырох частках з рэзкімі, у чымсьці традыцыйнымі кантрастамі руху і дакладнымі сіметрычнымі структурамі. Рацыянальны пачатак праяўляецца і ў новым для Глебава адчуванні часу ў музыцы. Гэта сімфонія без шматслоўнасці, без пустот, разгортваецца імкліва, як спружына, у афарыстычных формах. Кампазітар не толькі абмежаваў сваю часовую прастору, але і звёў да мінімуму аркестравыя і тэматычныя рэсурсы. У творы для струнных нельга различаць на «сілавыя» прыёмы і шматколернасць тройнога складу аркестра. Напісаная in C сімфонія, як казачнае дрэва, «на вачах» у слухача расце з мізэрнага пачатковага сугучча «до-рэ-бемоль». Складанасць заключалася і ў тым, каб вырасціць на гэтым дрэве парасткі з народна-песенных інтанацый і рытмаў.

Абмежаваўшы свой час, тэматызм і аркестравыя рэсурсы, кампазітар накіраваў намаганні да ўзбагачэння сродкаў развіцця і дабіўся значнага. Самая кароткая з партытур Глебава найбольш развітая, яна жыве, рухаецца кожнай клетачкай сваёй музычнай матэрыі. Ясграбная і трывалая канструкцыя лагічна прыгожая. Знаёмства з партытурай дае магчымасць гаварыць аб дапытлівасці, строгім гусце і тэхнічным уменні кампазітара.

Аднак спрэчкі аб гэтай сімфоніі не здаюцца мне беспадстаўнымі. Я б сказала, што ў гэтым творы «цяжка дыхаць», не хапае паветра, прастаты. Адчуваецца, што канчатковай мэтай кампазітара была важная і актуальная задача — знайсці больш дакладныя сродкі для раскрыцця складаных эмоцый. Але пакуль сродкі амаль усюды сталі больш складанымі. Партытура яўна пераўскладнена гарманічна. Гіпертрафія няўстойлівасці пад канец сімфоніі становіцца яе недахопам, таму што перастае ўздзейнічаць па-мастацку, а проста фізічна стамляе.

У сімфоніі дысанантныя, нават тоніка-дамінантавыя апоры, на якіх «вісіць» уся густа запарушаная прыгукамі тканіна. Астраўкі натуральна выразнай музыкі ў 3 і 4 частках вельмі малыя, іх лягчэй адрозніць вокам, чым вухам. Напор жа стыхіі дысаніравання вялікі і пераважае іменна ён.

Тым не менш, я пераканана, што сімфонію Глебава трэба паказваць, уключаць у праграмы адкрытых канцэртаў у рэспубліцы і за яе межамі. Партытура цяжкая, але заслугоўвае дакладнага і тонкага выканання. Яна сведчыць аб тым, што беларускі кампазітар намераны вырашыць шырокае кола праблем сучаснай музыкі (у тым ліку і пытанні творчага выкарыстання фальклору), што ён не звязвае сябе якойсьці адной, дагматычна трактаванай тэарэтычнай сістэмай і імкнецца да сінтэзу розных элементаў сучаснай музычнай мовы. Кампазітар авалодаў многімі сакрэтамі складанай тэхнічнай работы сімфаніста. Цяпер трэба знайсці новую прастату.

Т. ШЧАРБАКОВА.

АРТЫСТ І ПАЭТ

Яго запомнілі такім: уражлівая постаць, на дзіва арыгінальны гарнітур местачкоўца, фетравая панама з шырачэзнымі палямі.

— Надта ўжо цікавы быў чалавек... Комік... Як толькі даведаюцца, што Юзя Шчупак выступае на сцэне, усе Радашковічы ідуць глядзець, — успамінае колішняга сябра Сцяпан Пятровіч Васілеўскі.

— Здольны быў артыст, асабліва яму падабалася іграць камедыйныя ролі. З ім так добра было выступаць на сцэне, — дадае яшчэ адзін сябар Шчупака, Адась Язэпавіч Вольскі. — А як ён адчуваў беларускую мову! У яго яна гучала, што добра наладжаны музыкальны інструмент.

— А муляр які быў! Лепшага муляра не знойдзеш. Любіў складаныя мулярскія работы. Выкладаў з плітак ці з кахлі, мураваў будынiны. І зараз стаяць у Радашковічах ягонае работы мэблевы магазін, млын, жыллёвыя будынкі. Такую ж памятку аб сабе пакінуў у Заслаўі, Красным, Маладзечне, Ракаве і яшчэ шмат дзе...

У выдадзеным два гады таму назад Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР зборніку-анталогіі беларускай дакастрычніцкай паэзіі змешчаны вершы і Юзі Шчупака.

Мала хто ведае, што сапраўднае прозвішча і імя Шчупака — Язэп Язэпавіч Сайкоўскі. Нарадзіўся ён у 1890 годзе ў Радашковічах. Бацька памёр даволі рана, пакінуўшы жонцы дробную дзетвару. Здольны ад прыроды Юзя Шчупак не мог пахвал'цца адукацыяй — меў усяго тры класы Радашкоўскага царкоўна-прыхадскога вучылішча. Далейшыя веды настойліва набываў праз самаадукацыю. Маючы мулярскую работу (адзін раз больш грашовую, іншы раз менш), мог выдзеліць капейку-другую на набыццё кніжак: у Юзікавай хаце назбіралася неблагая біблітэчка, і ён вельмі радаваўся, калі аматары прыходзілі ўпазычкі пачытаць кнігу.

Праз сваіх землякоў — Аляксандра Уласава, Ядвігіна Ш., Міхалку Петрукова — Юзя Шчупак зблізіўся з «Нашай нівай», куды і пачаў пасылаць свае вершы, хоць і не надта дасканалыя, але шчырыя і простыя:

> Гэй, братцы, з ахвотай
> Старайцеся збыць
> Ланцуг вы цямноты
> Што вочы нам цьміць!..
>
> (Верш «Весела, смела...»).

У 1908 годзе ў «Нашай ніве» з'явіўся верш «Я гляджу на свой край»:

> Хай нарэшце людзьмі
> Пасля мук зажывём.
> Песню ўсімі грудзьмі
> Пасля слёз запяём!..
>
> («Я гляджу на свой край»)

Годам пазней быў надрукаваны ў той жа газеце верш Ю.Шчупака «Пташка», які спадабаўся ўкраінскаму перакладчыку беларускай літаратуры М. Шапавалу: побач з вершамі Янкі Купалы і Цішкі Гартнага Шапавал змясціў у другой кнізе «Літературно-навукового Вістніка» верш радашкоўскага паэта Юзі Шчупака.

Мы ўжо гаварылі: Ю. Шчупак быў артыстам-самародкам з зайздросным талентам. На самадзейнай местачковай сцэне ішлі спектаклі, дзе галоўныя ролі звычайна даручаліся Шчупаку. Спектакль «Чорт і баба» прыйшоўся да смаку не толькі ў Радашковічах, але і ў наваколлі. Разам са Шчупаком у спектаклі выступалі Ганна Зянькевіч, Людвіг Аўдыцкі, Янук Бараноўскі, Адась Вольскі і іншыя.

Яшчэ раней паспяхова ставілася беларуская п'еса «Міхалка». Грошы, якія сабралі ад продажу білетаў на гэты спектакль, пайшлі на абсталяванне сцэны. І яшчэ на лекі для бедных. Сам жа Юзя Шчупак даслаў нейкую частку грошай у рэдакцыю беларускай газеты, на яе падтрымку.

Вакол Юзі Шчупака складалася кола прыхільнікаў беларускай культуры. Нехта Празэльскі ставіў у Радашковічах беларускія танцы. Прыхільнікам усяго народнага быў яшчэ адзін інтэлігент, таксама карэспандэнт «Нашай нівы», Бельдзюкевіч. Частым госцем у Шчупака быў нашанівец з Івянца Міхалка Петрукоў (Лотыш), які ў сваім апавяданні «З мулярскі» вывеў вобраз свайго калегі-муляра.

У перыяд панавання пілсудчыкаў Юзя Шчупак зближаецца з выкладчыкамі Радашкоўскай беларускай гімназіі імя Скарыны. На кватэры Шчупака жыў вядомы прагрэсіўны дзеяч Заходняй Беларусі, выкладчык гімназіі Аляксандр Гаўрылік. Невядома, ці друкаваўся дзе Ю. Шчупак у заходнебеларускім друку, але відаць, ён усё далей адыходзіў ад паэзіі. І толькі сцэне былы нашанівец аддаваў сябе па-ранейшаму.

Памёр Юзя Шчупак у другой палове 1936 года, пакінуўшы радашкоўцам добрую памяць аб сабе.

Г. КАХАНОЎСКІ.

ЛЮБОЎ МОЦНАЯ І ВЕРНАЯ

СЕРЫЯ ПЕЙЗАЖАЎ К. КАСМАЧОВА.

Зараз лічыцца прыкметай добрага тону, калі ў вас на сцяне побач, скажам, з эстампам Красаўскаса вісіць якая-небудзь ікона. Старажытнасць увайшла ў моду.

Але мода і цікавасць — рэчы розныя, хоць і падобныя знешне. Мода прыходзіць і адыходзіць, цікавасць застаецца.

Дзесяць пейзажаў заслужанага дзеяча мастацтваў К. Касмачова — прыклад менавіта такой цікавасці. Пейзажы гэтыя, напісаныя маслам, не б'юць на знешні эфект. Невялікія памерам (крыху больш за сярэднюю кнігу), яны выкананы ў спакойнай гаме.

Яны, гэтыя дзесяць невялікіх карцін, з якімі мы пазнаёміліся на выстаўцы «50 гадоў БССР і КПБ», заслугоўваюць пільнай, непаспешлівай увагі. Непаспешлівай, як непаспешлівыя і спакойныя яны самі.

Дзесяць пейзажаў Касмачова — гэта дзесяць роздумаў аб мінулым. Аб мінулым, якое жыве сёння.

Не ведаю, ці задумваў мастак гэтыя пейзажы як серыю, ва ўсякім разе, яны так успрымаюцца. І яднае іх не знешняе падабенства, не агульнасць тэматыкі, а ўнутраная блізкасць, якая ідзе ад адзінства думкі майстра.

Я б асобна выдзеліў «Мірскі замак». У гэтай рэчы мастак адмовіўся ад перадачы падрабязнасцей. Замак выпісаны наўмысна грубавата — абрысы яго расплыўчатыя, і гэта яшчэ больш падкрэслена адбіткам у вадзе, які ўжо на замак амаль і не падобны. Кампазіцыя карціны добра «збалансавана» (чатыры вежы замка і дом за крапаснымі мурамі ўраўнаважаны і не даюць цэнтру цяжару «з'ехаць» ні ўправа, ні ўлева). І па вертыкалі ўсё выверана — замак і яго адбітак трохі ўрэзаны, што надае ўсёй кампазіцыі ўстойлівасць. Ад пейзажа вее такой спакойнай сілай, што, нягледзячы на трывожныя чырвоныя тоны (яны зусім не змякчаюцца зялёнай палоскай берагу), міжволі пранікаешся ўпэўненасцю — сіла гэтая рэальная і магутная. Гэта якраз тое нешта звыш «натуры», звыш «дадзенай рэальнасці», што Касмачоў убачыў вельмі тонка і дакладна.

Цікавы пейзаж «Мікуліна пад восень» пабудаваны, галоўным чынам, на сініх тонах і выкананы так, што з першага погляду можна памыліцца — масла гэта ці пастэль. Прыглядзеўшыся, бачыш — масла. Ніжняя частка палатна — цёмна-сіняя, густая, месцамі амаль фіялетавая рака. Холадам ад яе павявае, ветрам, восенню. Круты карычневы бераг (амаль без зеляніны), невялікая царква — белая, просценькая. За царквой — сяло. Зверху — белыя воблакі, у тон царкве. Ад гэтага і царква — быццам воблака, лёгкая, нібы плыве. Пейзаж сумны. Паглядзіце на яго, вас агорне смутак. Усё тут працуе на гэты смутак: і кампазіцыя (бягуць трапяткія воблакі, і царква-воблака за імі наўздагон), і колер (перамешаныя сінія тоны з белымі плямамі). Аб чым жа смуткуе мастак? Ці то аб зыходзячым лецe, ці аб старажытнасці, што дажывае свой век? І разумееш: шкада яму і лета, і старажытнасці.

Ёсць сярод дзесяці карцін Касмачова і два «чыстыя» пейзажы. Адзін — «Залатая пара» — мне не спадабаўся. Не ведаю чаму. Можа таму, што наперакор традыцыйнай «залатой» восені, якая слепіць вочы жаўцізной, надаў мастак сваёй рабоце густы, цёмны каларыт, а можа і па якой-небудзь іншай прычыне, але гэты пейзаж насцярожвае, нібы мы сустрэліся са старым знаёмым, які за час разлукі вельмі змяніўся, і нам незразумела, лепш гэта ці горш. І другі пейзаж — «Цёплы дзень» — вырываецца з агульнага настрою серыі. У ім нібыта ўсё правільна, але не кранае ён.

Затое зусім натуральна ўпісваецца ў серыю (будзем усё-такі лічыць гэта серыяй) палатно, якое, здавалася б, стаіць трохі ўбаку ад тэматыкі паказаных Касмачовым работ. Гэта — «Масква. Крэмль. Успенскі сабор». Малявалі гэты сабор многія, а ў такіх выпадках заўсёды ёсць небяспека «варыяцый на тэму».

Кампазіцыйна карціна вырашана на манер «Мірскага замка». Тая ж ураўнаважанасць, той жа спакой. Але відаць і розніца: лініі больш выразныя, дэталі больш дакладныя. Залатыя купалы ўзвышаюцца, як гімн. Бадай, гэта і ёсць гімн. Урачыстае песнапенне. Услухайцеся добра — можна нават пачуць харал. Само цела сабора, як шэрая глыба, але глыба стройная, нават прыгожая. І як бы для таго, каб падкрэсліць творчую думку старажытных архітэктараў — строгасць і стройнасць яе — на пярэднім плане —дрэвы. Голыя, бязладныя бярозы і непрыбраныя, пашматаныя елкі. Але гімна гэта не парушае. Шэрае неба адцяняе золата купалаў, і ад гэтага яны выглядаюць крыху сурова. Вельмі падобныя на шаломы старажытных воінаў. Хораша.

Цікавасць да старажытнасці, да прыроды ў Касмачова спалучаецца з любоўю. Мастак ставіцца да старажытнасці як майстар і даследчык, які сваім пільным вокам умее заўважыць велічнае ў будзённым, заўважыць і расказаць пра яго проста, але шчыра і хвалююча. Так, што мы, гледачы, разумеем — яго любоў моцная і верная.

Э. БРУК.

Тэатр

ПРАЗ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ ПАСЛЯ ПОСПЕХУ

«ГАДЫ НАВАЛЬНІЧНЫЯ» К. ГУБАРЭВІЧА У МАГІЛЁЎСКІМ АБЛАСНЫМ ТЭАТРЫ

БОЛЬШ за дзесяць гадоў назад на сцэнах Рускага тэатра імя Горкага ў Мінску і Магілёўскага абласнога тэатра была пастаўлена п'еса Кастуся Губарэвіча «Галоўная стаўка» — пра падзеі, што адбываліся на беларускай зямлі ў далёкую пару лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый у Магілёве, дзе, як вядома, была царская стаўка.

На падмостках сцэны з'явіліся першы савецкі галоўнакамандуючы Крыленка, салдаты і матросы, рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне, генерал Бонч-Бруевіч. Сярод дзеючых асоб былі цар Мікалай II, Керанскі, начальнік штаба Галоўнай стаўкі генерал Аляксееў, генералы Дзянікін, Духонін, Карнілаў. Падзеі і персанажы, аб якіх раней мы пераважна ведалі з дакументальнай літаратуры, набылі сцэнічнае жыццё.

Усё гэта прыцягвала ўвагу. Невыпадкова п'есай зацікавіліся і тэатры за межамі рэспублікі. Карацей кажучы, «Галоўная стаўка» мела поспех і, безумоўна, заслужаны.

За апошні час жанр дакументальнай драмы заваяваў трывалае месца ў тэатры і кіно. Ён не толькі набыў шырокую папулярнасць, але і пасталеў. З'явіліся такія, напрыклад, драматургічныя творы, як «Шостае ліпеня» і «Бальшавікі» М. Шатрова, «Народавольцы» А. Свабодзіна, некалькі дакументальных п'ес аб дзекабрыстах і інш.

Вось чаму Магілёўскі тэатр, задумаўшы зноў вярнуцца да п'есы «Галоўная стаўка», папрасіў К. Губарэвіча дапрацаваць яе. Так нарадзіўся другі варыянт п'есы і спектакля пад назвай «Гады навальнічныя».

— У ранейшым варыянце п'есы, — расказвае галоўны рэжысёр тэатра Б. Валадарскі,— нас засмучала шматслоўнасць, імкненне аўтара закрануць як мага больш тэм, звязаных з рэвалюцыйнымі падзеямі. Далей, мы ўвялі ў спектакль новы персанаж — супрацоўніка краязнаўчага музея. Гэта ён нібы расказвае наведвальнікам-гледачам аб падзеях 1917 года і тым самым звязвае мінулае з сённяшнім днём. Мы спадзяваліся, што гэта дапаможа пазбавіцца ад ілюстрацыйнасці некаторых эпізодаў, зробіць спектакль больш цэласным і блізкім гледачу. Выйграў ад гэтага ці прайграў спектакль, мяркуйце самі.

І вось — варыянт другі. «Гады навальнічныя».

У промні пражэктара — актрыса Н. Фядзяева. Яна выконвае ролю экскурсавода, ці, гаворачы тэатральнай мовай, вядучага. Скажу адразу, што з'яўленне ў спектаклі гэтай ролі, на мой погляд, нічым не апраўдана. Яна атрымалася каментатарскай і не больш. Гледачу тлумачаць тое, у чым ён сам здольны добра разабрацца, сочачы за падзеямі на сцэне. Мы ўвесь час адчуваем імкненне аўтараў спектакля прывязаць з дапамогай вядучага кожны эпізод да канкрэтнага магілёўскага адраса, часцей за ўсё да губернатарскага дома на Вале. Толькі мы пазнаёмімся з персанажам, пачынаем сачыць за яго роздумам, хвалявацца, як раптам нас «перабівае» вядучы, нешта тлумачыць, запрашае «выйсці» з тэатра і паблукаць па вуліцах горада, дзе адбываліся ўзноўленыя на сцэне падзеі. Так паўтараецца не адзін раз...

Але пакінем вядучага і паглядзім, з чаго ўтвараецца асноўная плынь спектакля «Гады навальнічныя», якія змены адбыліся ў параўнанні з першым варыянтам.

... Царская стаўка ў Магілёве. Генерал Аляксееў у прысутнасці Карнілава, Духоніна, Дзянікіна і Бонч-Бруевіча дакладвае цару абстаноўку ў арміі. Няма зброі, няма боепрыпасаў, няма амуніцыі — армія разваліваецца. Колькасць дэзерціраў расце з кожным днём. Асабліва на Паўночным фронце, начальнік штаба якога — генерал Бонч-Бруевіч.

Цар разгневаны. Ён патрабуе любымі сродкамі навесці парадак, умацаваць дысцыпліну — растрэльваць, растрэльваць, растрэльваць!

Высокі, сівы генерал моўчкі слухае імператара. Задумлівы позірк, спакойны твар, пачуццё ўласнай годнасці. І па рэакцыі залы адчуваецца, што Бонч-Бруевіч, ролю якога іграе артыст М. Радзіёнаў, адразу прыцягвае ўвагу гледача. Ад сцэны да сцэны ён усё больш заваёўвае сімпатыі сваёй прынцыповасцю, сумленнасцю, унутранай і знешняй высакароднасцю, інтэлігентнасцю. Перад намі вырастае складаны чалавечы характар — такога Бонч-Бруевіча я не помню ў «Галоўнай стаўцы». Адпаведна перамясціліся і некаторыя акцэнты спектакля.

У тым, старым варыянце п'есы многія значныя і нязначныя падзеі былі звязаны з лёсам салдата Сямёна Кныша, які спачатку верыў у гасудара-імператара і хацеў знайсці ў яго абарону ад несправядлівасці, а потым, упэўніўшыся, што цар такі ж кат, як і яго ваеначальнікі, зрабіўся актыўным удзельнікам рэвалюцыі. Ролю Сямёна Кныша іграў М. Радзіёнаў. Гэта была вельмі цікавая акцёрская работа. Радзіёнаву ўдалося тады стварыць адмегны вобраз наіўнага і кемлівага, дасціпнага і рашучага ў барацьбе за свае правы селяніна ў салдацкім шынялі. Спектакль ад гэтага набываў глыбокі сэнс. У цэнтры яго быў прадстаўнік народа, свядомасць якога фарміравалася ў рэвалюцыйныя гады пад уплывам бальшавікоў.

У «Гадах навальнічных» Сямён Кныш — персанаж амаль што эпізадычны. Да таго ж малады артыст М. Пахоменка не знайшоў у ролі неабходных сацыяльных акцэнтаў, і вобраз атрымаўся зусім бытавым.

Я не настойваю, каб Сямён Кныш абавязкова быў галоўным героем. Права аўтара — вызначаць ролю таго ці іншага персанажа ў п'есе. Але вельмі шкада, што герой, які палюбіўся гледачу, аказаўся ў новым варыянце п'есы збедненым і цьмяным. Побач з ім больш выйгрышна выглядае салдат Барадач, ролю якога выконвае А. Яфрэменка. Артыст імкнецца адшукаць неабходныя псіхалагічныя і пластычныя дэталі, знайсці тую неабходную меру рэалізму, якая б папярэдзіла ад найгрышу, ад тых «плюсікаў», што робяць сцэнічны персанаж штучным. Барадач Яфрэменкі вельмі пераканаўчы.

Немалаважнае месца ў спектаклі мог бы заняць яшчэ адзін прадстаўнік з народа — чыгуначнік Іван Палойка. Як вядома з гісторыі, на долю беларускіх чыгуначнікаў у семнаццатым годзе выпала вельмі важная місія — дапамагчы рэвалюцыі ў яе імклівым поступе. Іван Палойка якраз і павінен быць прадстаўніком гэтай часткі рабочага класа. На жаль, акрамя выдатнай акцёрскай фактуры ды формы чыгуначніка, нічога не паказаў на сцэне Ю. Напалкаў. Зрэшты, яго цяжка вінаваціць, бо аўтар не даў гэтаму персанажу непаўторных чалавечых рысаў, яркага аблічча.

У новым варыянце спектакля больш пашанцавала генералітэту. Што датычыць генерала Бонч-Бруевіча, дык гэта, магчыма, і правамерна. Нарадзіўся шматгранны, самабытны характар. Мы пабачылі, якімі складанымі шляхамі ішла руская інтэлігенцыя ў рэвалюцыю. Але атрымалася так, што ўвогуле варожы стан выпісаны драматургам больш ярка, а рэжысёр аддаў гэтыя вобразы лепшым артыстычным сілам. Ці пайшло гэта на карысць спектаклю ў цэлым?

Не адно такое пытанне ўзнікае, калі глядзіш «Гады навальнічныя» і параўноўваеш іх з «Галоўнай стаўкай». Так, у новым варыянце спектакля адчуваецца нямала страт. Перапісаць п'есу, аказваецца, не азначае зрабіць яе лепшай.

М. ГАРУЛЁЎ.

ФІЛЬМЫ ПРА ГЕРАІЗМ НАРОДА

У гарадах і сёлах рэспублікі пачаўся паказ фільмаў, прысвечаных 51-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Дэманструюцца лепшыя творы савецкай кінематаграфіі, якія расказваюць пра баявыя подзвігі і мірныя будні нашых слаўных воінаў — «Два байцы», «Балада пра салдата», «Ляцяць жураўлі», «Жывыя і мёртвыя», «Бацька салдата», «Малахаў курган», «Яна абараняе Радзіму», «Сакратар райкома», «Трое сутак пасля бяссмерця», «Салдацкае сэрца», «Разведчыкі» і многія іншыя.

У праграму кінапаказу ўключаны таксама беларускія мастацкія кінастужкі «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Дзеці партызана», «Трэцяя ракета», «Іван Макаравіч», «Чалавек не здаецца», «Годны да нестраявой», «Вуліца малодшага сына», «Альпійская балада».

У кінатэатрах і клубах у гэтыя дні дэманструюцца таксама хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі «Вялікая Айчынная...», «900 незабыўных дзён», «Жывым ад імя мёртвых», «Масквічы ў сорак першым», «Мінуты перад бяссмерцем», «Генерал Пушча», «Дарага без прывалу», «На Курскай дузе», «Дэсант у бяссмерце», «Вогненны горад», «Вялікая перамога савецкага народа», «Яны сустрэліся зноў» і іншыя.

К. РАМАНОЎСКІ.

РАЯЦЦА РАБОТНІКІ МУЗЕЯЎ

«Новыя формы работы ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». Гэтай тэме была прысвечана двухдзённая нарада работнікаў музеяў Брэсцкай вобласці. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі Цэнтральнага музея Савецкіх Узброеных Сіл і мінскіх музеяў.

Быў абмеркаваны таксама праект этнаграфічнага комплекса на базе Белай вежы ў Камянцы, які будзе адлюстроўваць гісторыю края XIII—XV стагоддзяў.

Работнікі музеяў пазнаёміліся з новай экспазіцыяй Бярозаўскага гісторыка-рэвалюцыйнага музея.

І. ДАШЧЫНСКІ.

З пошты ЛіМа

А НА СЦЭНЕ—«ЖЫЗЕЛЬ»!

На тым тыдні мне давялося трапіць на «Жызель» у Беларускі тэатр оперы і балета. Чамусьці гэты балет паказваюць на сцэне вельмі ж рэдка. Таму, мабыць, гледачы, якія чакалі яго, былі ў асабліва святочным настроі. Да таго ж у нашым оперным тэатры радуе гледача ўсё — святочнасць інтэр'ера, утульнасць і прастата залы, выдатная акустыка, музыка (праўда, аркестру хочацца пажадаць лепшага гучання), таленавітыя артысты і, асабліва, балет, дзе юнацтва, прыгажосць, грацыя радуюць вока і душу.

Балетная трупа — уся маладая, робіць вельмі прыемнае ўражанне. Мы глядзелі спектакль з задавальненнем, бо ігра слаўных выканаўцаў «Жызелі» — Давыдзенкі, Чахоўскага і Батвініка захапіла і павяла гледача ў свет чароўных падзей, якія адбываюцца на сцэне. І вось кульмінацыя — Жызель ашукана, узрушана, яна траціць розум. Музыка гучыць трывожна. І раптам раздаўся моцны стук... малатка або тапара дзесьці недалёка за сцэнай. Ён працягваўся, пакуль «памірала» Жызель. Навошта спатрэбілася рабочым або яшчэ каму забіваць цвікі ў час спектакля, ды яшчэ ў такі момант, калі балерына Ніна Давыдзенка павінна была «выкласціся» ўся і правесці гэту сцэну з вялікім напалам! Вядома, мы не атрымалі поўнага задавальнення, таму што стук малатка прывёў у замяшанне і балет, а гледача тым больш.

Мы думалі, што ў антракце (як гэта бывае ў тэатрах, якія паважаюць сябе) выйдзе на сцэну адміністратар і папросіць прабачэння за тое, што здарылася, у гледачоў і артыстаў. Але гэтага не адбылося. Адміністрацыя не надала выпадку значэння.

Не ведаю, як артысты і музыканты, але гледачы былі абураны грубым фактам, які меў месца ў час спектакля.

Т. САРОКІНА, урач.

Падзеі. Факты. Навіны

□ У памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі арганізуюцца сустрэчы студэнтаў зарубежных краін, якія вучацца ў мінскіх інстытутах і тэхнікумах, з дзеячамі беларускага мастацтва і літаратуры. Чарговая сустрэча студэнтаў з беларускімі кінематаграфістамі адбылася 18 лютага г. г. У госці да студэнтаў прыйшоў калектыў, які паставіў на студыі «Беларусьфільм» мастацкую карціну «Іван Макаравіч», — рэжысёр-пастаноўшчык І. Дабралюбаў, рэжысёр Л. Чыжэўская, аператар Д. Зайцаў і вучні мінскіх школ Л. Кочка і І. Бразгоўка, якія здымаліся ў фільме.

А. ЮЗЭФОВІЧ.

□ Год ленінскай ударнай працоўнай вахты столінскія кінафікатары пачалі з таго, што канчаткова адмовіліся ад кінаперасовак. У студзені адкрыты чатыры стацыянары ў невялікіх вёсках Лука, Вялікі Лес, Тмень і Варсы. Гледачы гэтых пасёлкаў былі апошнімі з магікан, да якіх яшчэ нядаўна прыязджалі кінаперасоўкі.

Сёння ў раёне вясковых гледачоў абслугоўваюць 76 сельскіх кінатэатраў, у палавіне з іх устаноўлена шыроказкранная апаратура.

Ударнай працай адзначаюць ленінскі год кінамеханікі Якаў Комік, Аляксей Тарашко, Сцяпан Залётка і іншыя.

Студзеньскі план абслугоўвання гледача столінскія кінафікатары выканалі на 125 працэнтаў.

Д. КУДЗЕЛЬКА.

Пра сяброў-таварышаў

МАЛА вольнага часу ў салдата. Мо некалькі гадзін у суткі. Але калі ты апантаны, то знойдзеш хвіліны, каб пасядзець з алоўкам альбо пэндзлем над аркушам паперы.

Перад вамі чатыры салдацкія малюнкі. Вядома, ім далёка да дасканаласці, але ў іх бачна жаданне аўтараў, актывістаў самадзейнай студыі выяўленчага мастацтва адной з часцей БВА, расказаць пра сяброў-таварышаў, пра салдацкія будні.

Радавы Л. Марчанка. «Зенітчыкі».

Ст. сержант В. Барысаў. «Па ўмоўным ворагу...», «У вольную хвіліну».

Ст. лейтэнант А. Салькоў. «На маршы».

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

Юрый Крыкаў працуе мастаком-афарміцелем на Аршанскім ільнокамбінаце. З 1961 года ён пастаянны ўдзельнік усіх рэспубліканскіх і абласных выставак самадзейных мастакоў, удзельнічаў ва Усесаюзнай выстаўцы. Звыш 150 работ напісана аматарам жывапісу. Карціны «Свежы вецер», «Асенняе вобрыва», «У пачатку студзеня» набыты Рэспубліканскім домам народнай творчасці. Зараз мастак мяркуе напісаць індустрыяльны пейзаж Оршы.

Фота Ул. КРУКА.

ПРЫКЛАД, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

На захадзе Беларусі, там, дзе да Нёмана коціць свае воды Гаўя, мяжа нашай рэспублікі робіць раптоўны паварот на поўдзень, а потым на захад і поўнач, утвараючы нешта накшталт мудрагелістага «мяшэчка». Тэрыторыя братняй Літвы вузкім клінам заходзіць тут у беларускія землі. У цэнтры яго — старадаўняе мястэчка Дзевянішкес. У ім і ў навакольных вёсках спрадвеку жывуць літоўцы. Аднак яны многім адрозніваюцца ад жыхароў цэнтральнай Літвы — беларускае «акружэнне» наклала адбітак і на мову, і на фальклор, і на побыт, і на рамёствы. Адным словам, у Дзевянішкес знойдзецца не адзін красамоўны прыклад плённага ўзаемадзеяння абодвух суседніх народаў як у галіне матэрыяльнай, так і духоўнай культуры.

Летам 1965 года ў Дзевянішскім сельсавеце пабывала комплексная экспедыцыя вільнюскіх краязнаўцаў. У ёй удзельнічалі гісторыкі, этнографы, фалькларысты, мовазнаўцы, прыродазнаўцы, супрацоўнікі Інстытута мовы і літаратуры АН Літоўскай ССР, студэнты універсітэта, вучні мастацкай школы — усяго 60 чалавек. На месцы да вільнюскіх энтузіястаў далучыліся мясцовыя краязнаўцы. Аб'яднанымі сіламі яны даследавалі прыродныя ўмовы Дзевянішскага сельсавета, яго гісторыю і эканоміку, мову, і побыт яго жыхароў, запісалі мноства народных песень і казак, прымавак і загадак, супаставілі атрыманыя вынікі з вынікамі сваіх нешматлікіх папярэднікаў (напрыклад, фалькларыста М. Федароўскага), якія дзейнічалі тут раней у адзіночку. Ад'язджаючы назад, члены экспедыцыі арганізавалі ў Дзевянішкес справаздачны вечар, а потым, у Вільнюсе, — справаздачную навуковую канферэнцыю, якая выклікала вялікую цікавасць грамадскасці.

І вось нядаўна, у канцы мінулага года, вынікі экспедыцыі былі «матэрыялізаваны» ў выглядзе саліднага і з густам аформленага калектыўнага зборніка пад назвай «Дзевянішкес». Ён адкрываецца артыкулам Часловаса Кудабы «Прыродныя ўмовы наваколляў Дзевянішкес». Услед за ім Ромас Батура расказвае аб гістарычным мінулым гэтага кутка. Аўтар прыгадвае, што ў дзевянішскім двары ў XVI стагоддзі жыў беларуска-польскі паэт Андрэй Рымша, устанаўлівае істотныя моманты яго творчай біяграфіі. На жаль, Р. Батура недакладны, калі сцвярджае, што вершы Рымшы на герб канцлера Валовіча і ў сувязі з выданнем «Літоўскага статута» 1588 года «напісаны на рускай мове». У сапраўднасці мова гэтых твораў старажытнабеларуская. Вельмі цікавым дапаўненнем да артыкула гісторыка з'яўляюцца ўзятыя з архіва «Звесткі пра стан сельскай гаспадаркі і промыслаў, сабраныя ў Дзевянішскай воласці Ашмянскага павета» ў канцы XIX ст. Іх аўтар — народны настаўнік, выпускнік Маладзечанскай семінарыі Рыгор Аўсюк.

Анталас Ціла, Вінцас Марцінкенас, Юозас Айдуліс і Ксаверас Дайнаўскас прысвяцілі свае артыкулы мінуламу і сучаснаму Дзевянішскага сельсавета. Раней гэта быў глухі куток царскай імперыі і панскай Польшчы. Мясцовае насельніцтва цярпела падвойны прыгнёт — сацыяльны і нацыянальны. Але яно змагалася за сваё разняволенне, за права вучыцца на роднай мове.

У зборніку «Дзевянішкес» падрабязна ахарактарызаваны народны быт гэтай своеасаблівай мясцовасці — земляробчыя прылады, рамёствы, вясковая архітэктура, унутраны інтэр'ер, хатні посуд, стравы, адзенне. У Дзевянішкес захавалася многа такога, чаго ўжо не сустрэнеш у іншых раёнах Літвы. І адначасова быт тут вельмі падобны на быт жыхароў суседніх беларускіх вёсак. Асабліва гэта заўважаецца ў адзенні, кераміцы, рэцэптах народнай медыцыны... Зразумела, што такое ўзаемадзеянне адбілася і на народнай лексіцы (плугас, скрынёс, чаравікус, дзешкос, вячэра, квартукас і інш.). Завяршаецца раздзел аб быце грунтоўным артыкулам «Сялянская сям'я», заснаваным на матэрыяле сацыялагічных даследаванняў. Кожная з 554 запоўненых у вёсках анкет —гэта яскравы доказ таго, наколькі змяніўся быт літоўскага хлебароба за гады Савецкай улады. Дарэчы, многія прадметы хатняга ўжытку, асабліва мэблю, жыхары Дзевянішкес купляюць у Беларусі.

Бадай, самым цікавым для беларускага чытача ў зборніку з'яўляецца артыкул Ванды Бараўскене «Літоўска-беларускія песенныя сувязі». Усяго ў час экспедыцыі было запісана каля 300 народных песень. Многія з іх спяваюцца як на літоўскай, так і беларускай мовах (напрыклад, «Яў вакарас вакарэя» і «А ўжэ вечар вечарэе»). Агульнае гістарычнае мінулае, сумеснае жыццё і барацьба супраць агульных ворагаў абумовілі і агульнасць песеннай тэматыкі, сюжэтаў і матываў. Часам адна і тая ж песня выконвае, у залежнасці ад мовы, розныя функцыі — «Ой, рэчанька, рэчанька» спяваецца як любоўная песня, а яе літоўскі аналог — як песня каляндарнага цыкла. А жніўныя песні (аўтар тлумачыць прычыны) выконваюцца ў Дзевянішкес толькі па-беларуску... У працы В. Бараўскене таксама многа арыгінальных назіранняў над агульнасцю і адметнасцю беларускіх і літоўскіх карагодных, вясельных, дзіцячых, сямейных, любоўных, застольных, ваенна-гістарычных песень.

Актыўнае ўзаемапранікненне беларускага і літоўскага фальклору засведчана і ў іншых артыкулах зборніка. Так, Вацловас Юодпусіс падкрэслівае, што музычны фальклор жыхароў Дзевянішкес, асабліва па кадэнцыі, па гучанні некаторых мелодый, па манеры выканання, даволі блізкі да беларускай народнай песні. Такую ж блізкасць адзначае Н. Велюс у галіне міфалогіі, Пране Іокімайцене — у дзіцячых песнях, Леанардас Саўка — у казках, Стасіс Скрадзяніс — у святкаванні Купалля і Юр'я.

У заключэнне трэба падкрэсліць, што дзевянішская экспедыцыя не з'яўлялася выключэннем. Вільнюскі аддзел Таварыства па ахове помнікаў і краязнаўству арганізоўвае такія экспедыцыі штогод. Яны праводзяцца на **грамадскіх пачатках**, у адпускны час. Кніжка «Дзевянішкес» — ужо трэцяя ў серыі літоўскай краязнаўчай літаратуры. Крыху раней выйшлі «Зярвінас» і «Ігналінскі край» (абедзве мясцовасці — таксама на літоўска-беларускім пагранічча).

Калі знаёмішся з выданнямі тыпу «Дзевянішкес», міжвольна задумваешся: а чаму б і нам не ўзяць прыклад з літоўскіх сяброў?! У нас таксама праводзяцца навуковыя экспедыцыі, але праводзяцца разрознена. Асобна, у розны час і ў розныя месцы едуць фалькларысты, этнографы, мовазнаўцы. Вынікі гэтых паездак належным чынам не абагульняюцца і не публікуюцца. Становішча яўна змянілася б, калі б такія экспедыцыі рабіць комплекснымі, а вынікі публікаваць асобнай кніжкай. Для пачатку можна было б узяць нейкі куток Палесся. Або нейкую мясцовасць на пагранічча з Літвой (Радунь, Гервяты). І запрасіць літоўскіх калег, у якіх ужо ёсць вопыт і якія, дарэчы, самі выказваюць такое жаданне. Мне здаецца, што для такой комплекснай экспедыцыі, хаця б і на грамадскіх пачатках, у нас знойдзецца нямала энтузіястаў, якім дорага мінулае і сучаснае роднага краю.

А. МАЛЬДЗІС.

Паэтычная паверка

Хаім МАЛЬЦІНСКІ

НОВЫЯ ВЕРШЫ

■ ■ ■

Трэба сіле
Пасталець!
Будзеш ад знямогі
Млець.

Ды лапату
Не кідай!
І ў душы
Глыбей капай!

Пласт зляжалы
Адвярні, —
Неўспадзеўкі
З глыбіні

Успыхне сноп
Праменняў... Стой:
Гэта шчасце
Ўжо з табой.

■ ■ ■

Сваіх турбот вазы,
Свае дарогі маеш.
А толькі і майго
Парогу не мінаеш.

Нічога не таю,
Паказваю да краю;
З тваім наступны крок
Ахвотна я звяраю.

Вага тваіх парад
Не мае адхілення
Ад меры дабраты
І шчырага сумлення

Не меў ты ад мяне
Удзячнасці ніякай.
Зноў ступіш на парог —
Зусім не за падзякай:

Так, быццам мімаходзь
Аддаць мне прывітанне.
То будзь жа ты здароў
Да новага спаткання!

ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ

Прыпарыла. Знясіліў пот і пыл.
І першы ўдар раскатны недалёка.
Мне розум засцілае павалока,
Дамоў дабегчы нестае ўжо сіл.
Бярэ задуха ў неадчэпныя абдымкі,
Хістаюцца, ўніз дахамі ляцяць будынкі,
Нібы ў імгненне тое на вайне,
Калі асколак пажадаў спыніцца
У касцях — і штурхануў на дол мяне.
...Прыпарыла. Вось грукне навальніца.

■ ■ ■

Такога болю
Не ўталіць нічым.
Трапечуць зноў пад полагам начным
І ўсё ярчэй цвітуць, як паясы,
Сем колераў апошняе слязы
Майго дзіцяці. Ззяе неба высь.
...Шчыміць і ные сэрца, як калісь.

■ ■ ■

Між людзей блукаў самотны
І не гаваркі.
І пішу табе я, Гінда,
Сумныя радкі.

Што на сэрцы утрапёным,
Колькі ў ім трывог! —
Не злічыў бы, не сказаў бы
Сам, напэўна, бог.

Толькі хваля, што ў кіпенні
Грымне цераз край,
Мусіць, нешта б расказала,
Паспрабуй спытай...

■ ■ ■

Было сэрца пустым,
Быццам кошык лазовы,
Ў мітульзе камяніц
І асфальтных двароў,
Покуль зноў не ступіў
У гушчар сваёй мовы,
Ў родны лес, пасвятлелы
Ад дзіўных дароў.

З яўрэйскай пераклаў А. ПЫСІН.

ВУСНЫ САЛДАЦКІ ЧАСОПІС

У адным з падраздзяленняў Беларускай ваеннай акругі трэці год запар выходзіць вусны літаратурны часопіс. Напярэдадні Дня Савецкай Арміі рэдкалегія падрыхтавала чарговы нумар, які называецца «Выраслі мы ў полымі». Перад слухачамі выступілі кавалер трох ордэнаў «Славы», адважны разведчык Трэцяга беларускага фронту Іван Шмея і ветэран Мінскага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Васіль Рыжкоўскі, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з жонкай змагаўся супраць гітлераўскіх акупантаў у партызанскім атрадзе.

Радавы Іван Лысенка, удзельнік калектыву салдацкай мастацкай самадзейнасці, прачытаў урывак з рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні».

Потым афіцэр Мірашнічэнка, якога ў другі раз вылучылі кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета, расказаў воінам аб новабудоўлях беларускай сталіцы, аб рабоце дэпутатаў. Студэнты тэатральна-мастацкага інстытута паказалі шэфскі канцэрт.

П. НІКАЛАЕЎ.

У гэтым урыўку дакументальнай аповесці пра паэта-рэвалюцыянера Валянціна Таўлая апісана сустрэча галоўнага героя са сваім сябрам па Лукішскай і Гродзенскай турмах Васілём Аляксандравічам Ражко, якая мела месца ў першыя месяцы нямецкай акупацыі і дала пачатак падпольнай антыфашысцкай групе, створанай Таўлаем у Навагрудку.

У групу таксама ўваходзілі сябар школьных гадоў паэта Леанід Аляксандравіч Барысаглебскі і таварышы па КПЗБ і турмах Кацярына Сцяпанаўна Главінская, Аляксандр Сямёнавіч Кляпацкі, Уладзімір Ігнатавіч Вайніла, прысланы з-за лініі фронту капітан войск НКУС Павел Фаміч Адынец, таксама знаёмы Таўлаю па Гродзенскай турме.

Апошні быў неўзабаве схоплены жандармамі пры спробе дыверсіі ў Навагрудскім вайсковым гарадку, уцёк з-пад канвоя і пры дапамозе Таўлая і блізкіх яму людзей — настаўніцы Гаравіцкай школы Ганны Мікалаеўны Васілеўскай, селяніна вёскі Палужжа Уладзіміра Іванавіча Ханько — быў схаваны і вывезены за межы Навагрудчыны і апынуўся ў атрадах партызан на Палессі, пасля ранення быў перапраўлены на «вялікую зямлю», потым зноў у тыл ворага. Адынец загінуў у Ліпічанскай пушчы ў красавіку 1944 года.

Уладзімір Вайніла быў расстраляны паліцыяй. Астатнія ўдзельнікі групы дзейнічалі да канца вайны на Навагрудчыне, дапамагаючы Валянціну Таўлаю ў зборы разведзвестак для партызанскага атрада імя Катоўскага, а са студзеня 1944 года і для спецгрупы «Буравеснік», якою камандаваў маёр Павел Ігнатавіч Лыскоў, псеўданім «Валеры».

Аўтар.

ПЕРШЫЯ ТЫДНІ пасля прыходу немцаў навагрудскі рынак пуставаў. Горад, нібы чалавек пад расстрэлам, затаіў дыханне. Але жывое мусіць дыхаць, прасцейшыя патрэбы жыцця націралі: абысці іх не мог ніхто. Чым элементарнейшая патрэба, тым больш яна неадольная. Паспрабуй не есці, не адзявацца... Не курыць—і то для курца пакута, з якой не кожны справіцца. Раскатурханыя настырнымі вымогамі бытавання, людзі пацягнуліся туды, дзе спрадвеку заведзена было набываць прадметы першай патрэбы. Спачатку нясмела выпаўзалі адны гараджанкі, потым, разведаўшы памалу, што для гандлю вялікага страху няма, на кірмаш папхалася вёска.

Пайшла мена.

Час нібы адступіў на тысячы гадоў назад. Старажытная гара Міндоўга, ля падножжа якой ляжаў навагрудскі рынак, панура ўспамінала даўніну.

Калі тое было, што натуральны абмен панаваў на рынку? Даўно ўжо мена саступіла месца грошам, і толькі ў нейкія выключныя гады жыццё вярталася да аджытага. Тутэйшым старажылам такія павароты запаміналіся: першая сусветная вайна, потым гады разрухі, потым крызіс трыццаць трэцяга. Заўжды паяўлялася мена—спешны паратунак ад застою і голаду.

І вось зноў:

— Што прадаеш, чалавеча?

— Пуд мукі ржаное.

— Колькі просіш?

— Ты спытай, на што мяняеш, то мо старгуемся...

— Ну дык я і пытаю, што хочаш?

— А хто яго ведае, што табе сказаць. Гавары, што маеш.

— Не, ты спярша—што просіш.

— Што ж тут запрасіць, каб не пакрыўдзіць—га? Трэба якія чаравікі ці тухлі дзяўчыне, да зарэзу трэба; каптан зімовы хлопцу—з пастушка ростам. А што людзі дадуць—хто ж яго ведае, за гэты пуд мукі...

Грошы не толькі страцілі цану, а сталі ўтрапеннем чалавека на кірмашы.

Немцы прымушалі браць грошы сілаю: падступаў жандар да чалавека, забіраў масла, сала ці яйкі і тыцкаў «грошы». Каб хоць савецкія рублі, іх можна было б прыхаваць да лепшых дзён, а то сучылі акупанцкія маркі, паперкі, што не мелі ходу нават у Германіі! А тут і ўвогуле не было магазінаў, дзе можна хоць што колечы купіць за іх. Гарадскія жыхары, праўда, разлічваліся маркамі, за хлебны паёк. Але ўвесь паёк—па трыста грамаў на едака! Многа тут грошай трэба?.. Бяда, што за грошы, ды не купіш. Пайкі спачатку адпускалі па пашпартах, потым увялі карткі—маленькія талончыкі, падобныя на паштовыя маркі, на якіх стаяла магічнае слова «Хлеб». Займець бы лішнюю картку! А то грошы... Вяскоўцам дык і ўвогуле такія грошы былі не патрэбны. Хіба толькі які дзівак-чалавек, што хаваў у скрыні яшчэ «кацярынкі», «керанкі», савецкія з дваццатага году, потым польскія, ізноў савецкія з трыццаць дзевятага,—хіба толькі такі мог зараз прадаць прадукт за грошы.

З надзеяй на чалавека, які прадасць за грошы, хадзіў па рынку Валянцін Таўлай. Хацелася есці і курыць. Смактала пад ложачкай, туманілася і кружылася галава. Валянцін апытваў многіх прадаўцоў, але прадаваць на грошы ніхто не хацеў.

Не харч, а нават посуд ішоў толькі на мену.

— Гарнушкі пачапаўскія, не б'юцца і ў агні не пэнкаюць!—зазываў людзей пажылы ганманлівы ганчар.—Купляйце, людзі добрыя! Як задарма! Насып гарнушак за гарнушак. Ці жытам, ці ярынкаю—усякаю пашнінкаю. Купляйце!

Пры адным упаміне пра грошы ніклі твары людзей: баяліся, каб не нанесла «тайнага», бо грошы сілком сучылі толькі жандары, паліцаі ды шпікі.

Настрой у Валянціна быў паганы: памятнае з турэмных год бяссілле жаданняў... Ды там было куды лягчэй зносіць гэтыя пакуты: турэмныя краты, абабітыя жалезам дзверы, глухія муры запіралі думку, скоўвалі волю і неяк памагалі сціснуцца целам і душою, задушыць жаданні, нават элементарныя: голад, ахвоту закурыць. Цяпер чалавек быў нібыта на волі, а заставаўся яшчэ больш бяссільным, як там. Ды што раўняць: там—калектыў, а тут — адзін, сапраўды Паўлюк Сірата, д'ябал падказаў калісьці гэты псеўданім.

Ранкі на Навагрудчыне халодныя. Валянцін праціскаўся паміж вазоў, тулячы галаву ў абшмуляны каўнер пінжака. Ужо хацеў вяртацца назад да Алеся. Надзея рэалізаваць свае шэсць чырвонцаў, што заваляліся ў кішэні, прапала. А так хацелася прынесці хоць які ласунак Алесевай дачцы ды і самому разгавецца хоць жменькай «карашкоў»—тоўчанага тытунёвага цаціў'я.

— Чаравічкі-невялічкі для дзеўкі і маладзічкі! Налятай, жаніхі!

Валянцін спыніўся. Ён любіў яшчэ гімназістам прыслухоўвацца да рэкламных раешнікаў у Вільні на Казюковым кірмашы. Сёння ж балбатня гандляроў раздражняла, нейкім цынізмам несла ад бяздумнай весялосці. Але ён перамог сябе і стаў слухаць.

— Чобаты, чобаты вы мае,—выкрыкваў нейкі шыракароты балбатун,—нарабілі клопату ды вы мне! Каб не тыя чобаты, што зяць даў, ды за тыя чобаты дочку ўзяў. Чобаты, чобаты вы мае!..

І раптам за спіною пачуўся мяккі, знаёмы голас:

— Валянцін?..

Ён павярнуўся. Перад ім стаяў чалавек сярэдняга росту. Бледны твар. З-пад кепкі выдаваўся шырокі падлысела лоб. Здзіўлена пазіралі блакітныя вочы, такія балесныя, як у дзяўчынкі-сіроткі.

— Васіль!..

— Няўжо ж! Я. Вось цябе ніяк не спадзяваўся... Каго-каго, а цябе тут, ну проста—як гара з гарою...

— А я цябе шукаў,—неспадзявана для сябе вымавіў Таўлай і адчуў, што гэта сапраўды так, што шукаў-такі блізкае душы ў рыначным натоўпе.—Чаму ж ты такі благі, Васіль, як з таго свету?

— Ты ўгадаў,—адтуль і выйшаў. А сам таксама выглядаеш...

Гэта быў Васіль Ражко. Сябры абняліся, прыцягваючы чуласцю прывітання цікаўныя позіркі. Каб не збіраць вакол сябе раззяў, яны сышлі ўбок і разгаварыліся.

— Я, братко, так рады і нават табе зайздрошчу,—жаліўся Васіль,—усё ж не так тут цябе ведаюць. А я—і дома, і ва ўцёках. Як заяц пад кустам. Надаеў, браце, ужо і родным і неродным. І самому агоркла туляцца па гумнах. Ніводнай ночы дома не начую. Вось забрыў на кірмаш, а чаго, спытай—то, дальбог, не ведаю. Бяда гоніць у рух На нешта спадзяешся, абы не на месцы... Змардаваўся, ох і змардаваўся—ушчэнт. Не магу ўжо... Добра, што цябе хоць сустрэў, як кажуць, друга па няшчасці. Ды табе, скажы, Валянцін, усё ж не так? За табой не палююць? А я ў любы мамэнт магу нарвацца. Давай сыдзем куды, што мы гэта так. на відавоку...

— Нейкі ты як не той, Васіль? Такі вынослівы палітзак быў! Яшчэ і мяне вучыў у галадоўку вашу навагрудскую.

Наблізіўшыся да Васіля, Таўлай упаўголаса праскандзіраваў:

Нас не зломіць нядоля ліхая,
Не сагнемся прад ёю дугой...

— Так, здаецца, таварыш Ражко?

—Ці-іх... — Васіль тузануў Валянціна за рукаў.—Я табе заўжды казаў, што не асцярожны ты. І ціхманы ж, здаецца, такі, а што асцярогі—ні на магулінку. Пойдзем. братко, адгэтуль, покі не позна. А то даспяваемасё, як тая курыца перад вялікаднем

— Дык жа курыць ахвота. Душа смягне. Ты ж можаш...

— От яшчэ клопат! Як малое дзіця... Ну, ладна, пастой тут. Я, авось...

Васіль вярнуўся і падаў добрыя шчопаці едкага накрышанага самасаду. Яны паглядзелі адзін аднаму ў вочы, як змоўшчыкі, усміхнуліся той усмешкай, што мацней грэе за самыя цёплыя словы.

Завулкамі сябры пайшлі ў кірунку фарнага касцёла, выглянулі на замчышча, перабраліся цераз вал і прылеглі за ім у гушчары маладога парку на сухім подсціле асенняга лісту. Немцы сюды не заходзілі. Яны лепш адчувалі сябе на самай гары, ля вежаў. Валянцін папрасіў расказаць пра знаёмых палітзакаў з Наваградчыны: ён ведаў, якая палёгка ў такі момант чалавеку—выгаварыцца; у размове пра сяброў чалавек пазбываецца цяжару адзіноты і бяссілля. У Ражка, відаць, душа была перагружана пакутлівымі ўражаннямі, бо, паабяцаўшы расказаць пра сяброў,—а як жа, братко, ведаю сёе-тое пра нашых хлопцаў, нават пра тых, што ты і не здагадваешся,—ён павёў гаворку пра сваё, пражытае, пра першыя дні вайны. Уздрыгваючы ад хвалявання, нібы перажываў усё спачатку, нібы апраўдваўся і хацеў пачуць словы пацехі, ён гаварыў:

— Прыбег я дамоў. Яшчэ нашы тут былі. Усе на месцах. Але ўжо сумятня, паніка, неразбярыха. Як у пекле. Адыходзіла і войска, і цывільныя—усе разам—з-пад граніцы. А ў Шчорсах у нас актывісты начаку: ждуць распараджэння. Так і не дачакаліся. Я з групай хлопцаў рашыў у Любчу, у раён, даведацца, што рабіць. І раптам каля Сенна, вёсачка такая тут недалёчка, ідзём і сустракаем... Не здагадаешся. Валянцін, каго?

Васілёў твар прасвятлеў, вочы ажылі ранейшым бляскам, ён ужо расказваў пра ваенную завіруху, як пра нешта рэальнае. Чалавек, відаць, здолеў крыху паслабіць нервы, напятыя да адказу. Седзячы побач з сябрам, схаваны ад чужых вачэй, ён адчуваў сябе амаль шчаслівым. Валянцін таксама. Прагнаўшы васілёвым самасадам голад, ён слухаў з той урачыстай дабратою ў душы, якая наступала кожны раз, калі здаралася памагаць сябрам вызваліцца ад грузу трывог, страху, дэпрэсіі.

Праўда, цяпер у самога не было тое ўпэўненасці, што раней. Бывала, ён адчуваў сябе свабоднаю птушкай, жаўруком вялікай ідэі. Горыч сяброўскіх сэрцаў, якія не маглі яшчэ парваць сваёй сувязі з домам, сям'ёй, звычкамі клапатлівага дамашняга жыцця, і міжвольна, сваёй тугою па ўсім гэтым, уносілі нейкі дысананс у суровы турэмны калектыў,—была яму зразумелай. Ён шкадаваў сяброў і памагаў ім, адчуваючы сваё права на гэтую дапамогу, права ветэрана, права чалавека, які з дзіцячых год перамог сябе дзеля ідэі. Цяпер жа, як толькі ён спрабаваў стаць духоўным дарадчыкам, у сэрца закрадвалася збянтэжанасць, прычыны якой нельга было зразумець. Варта было адчуваць сябе дужэйшым за Васіля і толькі намерыцца прыняць частку яго непасільнае ношы, як адразу апаноўвала скруха і няяснае жаданне ісці шукаць яе, сяброўку жыцця, якую абавязаны быў уладкаваць у гэтым ашалелым свеце перш за ўсё, умацаваць веру, не для яе, а для сябе, каб мець поўнае права памагаць іншым, умацоўваць усіх як вось і цяпер—гэтага, змардаванага жахамі лёсу сябра.

— Ты чуеш мяне, Валянцін?—настойваў Ражко на сваёй загадцы.—Мусіць пра нешта сваё думаеш? Не чуеш? Каго я мог спаткаць, га?

— Чаму ж,—ачнуўся Валянцін,—я думаю... Кацю Главінскую, яна ж адгэтуль, здаецца,—Валянцін зусім нечакана назваў прозвішча іх агульнай знаёмай.

— Не, не яе, братко. Давялося чуць, што яна тут, недзе хаваецца, але там была не яна.

— Тады не ведаю.

— Я і казаў, што не ўгадаеш,—ажывіўся Васіль.—Пестрака.

— Няўжо! Дзе ж ён?

— Пастой. Падыходзім мы да Сенна. Людзей розных на дарогах—каб ты толькі бачыў! Ужо нават не звяртаеш увагі на нікога—праціскаешся, абы прабрацца. Ажно бачу, сядзіць пад прысадаю групка. Я—зірк... Адзін твар знаёмы. Прыглядзеўся і пазнаў, адразу пазнаў. Піліп Пестрак! А побач жонка яго з дзіцем і яшчэ пару чалавек бежанцаў. Я да іх. Давай мы вітацца, абдымацца. І ведаеш, што мне расказалі? У іх блізняткі нарадзіліся, ты чуў?

—Бачыў, не толькі чуў. Я ж перад вайною ездзіў у Беласток. Зборнік мой там рыхтавалі да друку з Піліпавай і Максімавай дапамогай.

— Ты з Беластоку ў Ліду, а я з Быценя,—падхапіў Васіль. — Прабіраліся ўсім гарфа. Бамбёжка рассеяла, разагнала, каго куды. Я дамоў прыбіўся і думаў са сваімі хлопцамі адыходзіць. А тут Пестрак... Дык, браце, у іх такая бяда! Як хаваліся аб бамбёжкі, нехта спадарожны адно іхняе дзіця падхапіў на рукі—памагчы ім. А ноч, адбіўся недзе з дзіцем. Прапала малеча! Вельмі гаруюць яны. Думаў, як ім дапамагчы, каб хоць вырваліся. Павёў у сваю вёску, у Балотца, угаварыў суседа свайго, Барэйку, падвезці іх. Казаў той чалавек, што давёз амаль да Стоўбцаў абалонем, уздоўж Нёмана. А там бамбёжка ізноў. Усе разбегліся. Падводчык, мабыць, драпануў з перапуду. Дарма на Стоўбцы паехалі. Трэ было на Рубяжэвічы, цераз пушчу... Нашым старым падпольным шляхам. Я тудою, як быў сакратаром ў Шчорсаўскім райкоме, усю літаратуру з Мінска прымаў. Колькі разоў самому хадзіць да старой савецкай граніцы прыходзілася, і ўдачна. Мясціны глухія. А мо' якім спосабам і прарваўся Пестрак? Не ўгадаеш, кудою яно лепш... у такі час...

— Хай бы хоць ім пашанцавала,—уголас падумаў Валянцін і адчуў нейкую як бы сваю вінаватасць, што сам не меў дзяцей і што яму з Кірай лягчэй за многіх удалося перажыць страшны час перамены. Ізноў ён убачыў сябе як бы недагружаным цяжарам жыцця і змагання ў параўнанні з Пестраком—вялікім пакутнікам і змаганцам сярод заходнебеларускіх паэтаў, іхнім нязменным турэмным старастам, аскетычным і бескампрамісным чалавекам, перад якім неяк заўсёды бянтэжыўся, як малодшы перад старэйшым. Бянтэжыўся і ў душы пабойваўся. «Што сказаў бы Піліп, каб паслухаў тут нас?» Крытыкаваў бы за слемазарнасць? Патрабаваў бы пратэставаць? Па спіне прабегла дрыготкая гарачая хваля. Ён заўважыў, што яны даўно маўчаць, і неяк наспех і з удзячнасцю сказаў Васілю:

— Не бядуй, усіх бядот не перабядуеш. Ты зрабіў усё, што мог. Як жа ты сам застаўся?

— Так і застаўся. Мянташыліся, мянташыліся ды бачым, што засталіся... Позна агледзеліся. Каб жа чалавек тое ліха ведаў, дык уцячы яно можна было. Хоць, сказаць па праўдзе, і там нас не вельмі чакалі, такіх сваякоў-заходнікаў... Нашы некаторыя, што швыдчэйшыя былі, то з-пад старой граніцы вярнуліся. Неяк і абідна было: савецкая ўласць і ўцякаць, усё набабах кінуўшы—не ганарова... Завіхаліся, спадзяваліся: а ну ж, яшчэ нашы здачы немцу дадуць. Так і дачакалася баба Пятра—сыр есці. Паверыш, на валаску жывы застаўся.

— Кругом, браце, такое, хіба толькі у вас...

— У трыццаць дзевятым мы з табою цэлы верасень у Гродне былі. У баявой дружыне—памятаеш? А тут, ля Шчорсаў, тады дзень ці два, як нашы вызвалілі, было без улады. Я табе, здаецца, гаварыў, як у цябе ў Лідзе спыняўся, што нашы шчарсуны-падпольшчыкі тады стаўпецкага каменданта і заадно шчарсоўскага войта сваім правам на той свет спрвадзілі? Гнеў накіпеў—расправіліся... А там знайшліся атлёты, што яшчэ пад гарачую руку давай і таго, каго падазравалі як даносчыкаў... І солтысавага сына—знаеш... гэты, во, браток, як бы нявінна... Так растравіўся люд—бяда! А ў кожнага родзічы... Хто б ён і не быў, а свой за свайго стаіць. І захадзілі вось цяперака, як немцы занялі. А тут яшчэ збайкатаваны адзін настаўнічак-гіцаль ды млынарова Манька, ды яшчэ шантрапа ўсялякая спіскі, кажуць, напісалі, карнікаў наклікалі. Пахапалі на трэці дзень нас усіх, актывістаў, чалавек больш трох дзесяткаў. Усіх загалам. Заперлі ў графскім маёнтку пад стражу. Пахожа, як нас тады палітзакаў, у Гродне, палякі ў верасні. Ды не, не тое: палякі ўсё ж разбіраліся, хоць для віду. Прысуд нейкі там выносілі... А тут!.. Тры дні чакаем без яды, без вады пад аховай. Прыйшлі немцы. Выстраілі ўсіх ля графскага амбара пад сцяну, вачыма да муру і давай браць па аднным. Спытае не ў чалавека, а ў паліцыі: «Хто гэты?» «Актывіст, камуніст». «Адвясці!». Навальваюцца гуртам і—прыкладамі па галаве, па галаве... Акрываўляць. І ляжачага б'юць. А тады падымуць і да другое сцяны тварам ставяць.

Падышла на мяне чарга. Немец пытае цераз пераводчыка: «Кім гэты быў?» — Маўчаць. «Хто яго прывёў?» Маўчаць. А я, братко, стаю і не дыхаю. Абмерла ўсё. На шчасце маё, паліцэйскі, што мяне прывёў, недзе павалокся. «У старану»,—загадвае жандар. Такіх набралася нямнога—чалавекі чатыры. Адвялі нас і разам з байцамі-палоннымі заперлі ў школе. Астатніх пагналі на расстрэл. У парк. Ты ўяўляеш, як гэта перажыць, браток ты мой!.. І чуем мы, закрычалі там хлопцы пад растрэлам як бы «ура!» А потым залп... А яны ізноў «ура!»—толькі цішэй, з енкам. Тады другі залп...—усё... Толькі вараннё як закрумчыць... Убягае тут на дзядзінец жонка аднаго нашага хлопца, Надзя Каляда. З вузялком у руках. Мусіць, перадачу хацела цераз ахмістрыню графскую перадаць. Як пачула ўсё—дык і аслупянела... А нехта з палонных паказаў ёй праз акно рыдлёўку, а потым рукі накрыж зложыў... Дык у яе ногі так і падкасіліся. А немец дула наставіў і да яе. Шчасце, што ахмістрыня надышла графская. Выхапіла ў Надзі вузялок і нешта паказвае, нешта гаворыць немчуры. Адбараніла. За шыю яе абняла і павяла да сябе ў флігель, як сонную вяла...

Валянцін перавёў позірк удалячынь: скруха і боль, пакутлівая бяссільная нянавісць падняліся ў душы і не мелі выйсця. Перад вачыма ўсталі чатыры высокія чырвоныя цагляныя сцяны і пасярэдзіне роспачны сілуэт жанчыны... На момант ён выразна ўбачыў яе твар і жахнуўся: гэта быў твар мачыхі, цёткі Стэфы, скрыўлены болем і жахам твар... Потым здалося, што гэта Каця, яе спалоханыя вочы, як у час расстання, урэшце, перасільваючы тыя здані, выплыла яна—Кіра. Як заўсёды, дзёрзкая, з сівой пасмай у чорных пахлапечы стрыжаных валасах. Яму хацелася памкнуцца да яе, пазваць, але як толькі акрэслілася гэта жаданне—усё знікла... Толькі душа пакутліва смылела і часта з болем стукала сэрца. Ён усёй істотай разумеў, што з гэтых пакут не можа быць іншага выйсця. як толькі адно—паўстаць! Хоць загінуць, але не цярпець у бяздзейнасці.

Ад зямлі цягнула холадам, Валянцін павярнуўся на жывот, падставіў сонцу азяблы бок. Запахла церпкім водарам прэлага лісту.

— А я ўсё сяджу пад каравулам,—цягнуў Васіль.—Стаў прасіць аднаго з ахраны—усе ж, падлы, знаёмыя, тутэйшыя. Перадай, — кажу, майму бацьку: хай сходзіць да такога і такога паліцыянта ды пагаворыць, спытае, за што ён мяне сюды запякаў. Перадалі неяк, Бацька мой бягом да таго самага... Не ведаю, што там яму стары казаў, але такі дадзеў, мусіць. Стала таму ці брыдка, ці боязна, гарачка яго там ведае. Бо то ж упершыню са сваіх жа вёсак ды столькі людзей загубілі... Ну, адным словам, не рашыўся ён даканаць мяне. Так і выпусцілі. Пасля таго я на вочы ім не паказваўся: па гумнах усё, ды па гумнах... Але ж і гэта не выхад. Яшчэ больш падазронасці на сябе набярэш... Думаў, прайшоў самы хапун. Пранясло. Выйшаў. А мяне ізноў—цоп!—арыштавалі... Сам камендант удае немцам, што камуніст. То яшчэ шчасце маё, што вайсковы білет пры мне быў. Дастаю, глядзіце—беспартыйны. У цябе, Валя, таксама, ці ты аформіўся?

— Не паспеў...

— Дык вось гэта і мяне выбавіла. Ой, ці толькі надоўга? Ведаю, што сыходзіць павінен з дому, бадай яны сышлі кроўю. Трэба недзе неяк уладзіцца здалёк ад дому. Нічога не папішаш...

Да Васіля вярталася звычная яму сялянская разважнасць і практычнасць. Чалавек мацней пачуў сябе на зямлі. Валянціну гэта спадабалася.

— Ты праўду кажаш: фашысты баяцца людзей бескантрольных. Не дадуць яны жыцця такім. Ведаюць, чым гэта пахне. Загад за загадам у горадзе, каб усе ішлі на працу. Пад пагрозай смерці...

— Дык вось жа... Дзе тую працу знойдзеш,—закавыка. Да гаспадара дзе прыладзіцца—набралі ўжо васточнікаў, хто меўся браць. Ды і падазронасць застанецца: чаму сам з вёскі, а дома не жывеш?..

(Заканчэнне на 4-й стар.)

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

СОНЕЧНЫЯ ФАРБЫ УКРАІНЫ

Як мы паведамлялі ўжо, у памяшканні Мінскага мастацкага салона-магазіна і ў залах акруговага Дома афіцэраў адкрылася перасоўная выстаўка твораў мастакоў Украіны. Прапануем увазе чытачоў артыкул аб выстаўцы і яе ўдзельніках, напісаны для нашай газеты ўкраінскім мастацтвазнаўцам М. Туроўскай.

НА ГЭТАЙ выстаўцы мінчане сустрэнуцца з карцінамі народнай мастачкі УССР Таццяны Яблонскай і скульптара Іны Каламіец. Работы іх выстаўлены ў мастацкім салоне. У акруговым Доме афіцэраў прадстаўлены жывапіс народнага мастака УССР Мікалая Глушчанкі і заслужанага дзеяча мастацтваў УССР Яўгенія Валабуева, а таксама графіка, заслужанага дзеяча мастацтваў УССР Георгія Якутовіча.

З карцін Т. Яблонскай, бадай, варта ў першую чаргу адзначыць работы, у якіх па-новаму раскрыўся яе талент. Гэта карціны «Пісанкі», «Май», «Нявеста», «Прадаўшчыца папяровых кветак». Мастачку вабяць матывы народных абрадаў, майстэрства народных умельцаў, праца аратых, буйны росквіт вясны. У традыцыях народнага мастацтва яна чэрпае не толькі тэмы сваіх палотнаў, але і асаблівую, уласцівую яму дэкаратыўнасць, свежую яркасць фарбаў. Колер у Яблонскай іншы раз танальна збліжаны, іншы раз адкрыты, лакальны, але нязменна гарманічны. Уменне перадаць у дэталі галоўнае, закончанасць кампазіцыйных рашэнняў, адзінства нават кантрасных тонаў, тонкае пачуццё каляровых спалучэнняў — вось характэрныя рысы таленту Т. Яблонскай, якія праявіліся ў яе новых работах. Яны часам выклікаюць спрэчкі, але разам з тым нязменна прывабныя і цікавыя.

Іна Антонаўна Каламіец прадстаўляе больш маладое пакаленне мастакоў. Характэрна, што, звяртаючыся да народнага эпасу, да твораў Тараса Шаўчэнкі і Лесі Украінкі, скульптар не проста ілюструе іх, а творча пераасэнсоўвае. Яе барэльефы «Ярыла», «Маўка», «Вакула», «Вадзяны» ўражваюць выдумкай, разнастайнасцю, багаццем стылявых прыёмаў, адмысловай арнаментыкай, гучнымі каляровымі спалучэннямі. Мастачка тонка адчувае матэрыял, працуе то ў дрэве, то ў тэхніцы маёлікі, то ў сучасных матэрыялах, такіх, як, напрыклад, шклоцэмент.

Гледача, несумненна, прыцягнуць цэльныя і абагульненыя вобразы хлебароба («Хлеб фронту»), маці, якая зберагае жыццё і працягвае род («Корань роду»). Старонкі трагічнай гісторыі Украіны як бы раскрываюцца ў скульптурным трыпціху «Бабін Яр». Работа гэта сімвалічная, своеасаблівая па пластыцы і тэхніцы разьбы.

У невялікіх фігурках са шклоцэменту аўтар увасобіла свае ўражанні ад паездкі ў Японію. У іх дакладна знойдзены сілуэты, перададзена ўласцівая японкам манернасць, зграбнасць, пластычнасць. Тое ж тонкае пачуццё пластыкі, уменне перадаць нацыянальную своеасаблівасць і ў вобразах егіпцян, створаных пасля паездкі ў краіну старажытных пірамід.

З многіх таленавітых твораў Мікалая Пятровіча Глушчанкі мне б хацелася вылучыць тры карціны, напісаныя маслам, і звярнуць увагу на серыю манатыпій.

Карціна «Украінскі матыў» створана ў 1965 годзе. У ёй паказаны куток старой Украіны: саломай крытыя хаты на беразе Дняпра, зялёны лес і неабсяжная далячынь пад зяючым сонцам.

У 1966 годзе мастак піша карціну «На будаўніцтве Кіеўскай ГЭС». Раскапаная зямля, будынкі, краны... Дзе гэта? Ці не на месцы тых самых хат? Мастак не акцэнтуе гэтага, але сваімі палотнамі нібы падкрэслівае: мяняюцца мілыя пейзажы, абнаўляецца зямля Украіны.

А вось палатно «Вясновы сад». Каляровая гама з наўмысна ўмоўнымі плямамі зеляніны. Сонца, квецень, спакой. Здавалася б, для мастака-пейзажыста ўсё ўвасоблена ў фарбах прыроды і ёю вычэрпваюцца яго інтарэсы. Але і ў гэтых пейзажных палотнах мы адчуваем прысутнасць чалавека з яго дзейнасцю, напружанай творчасцю і барацьбой.

Новым этапам у творчасці Глушчанкі стала работа над манатыпіяй. Гэта тэхніка раскрыла неабмежаваныя магчымасці для пошукаў нечаканых, тонкіх каляровых суадносін. На выстаўцы можна ўбачыць адны і тыя ж матывы, выкананыя маслам і ў тэхніцы манатыпіі. Такія, напрыклад, як «У майстэрні мастака» і шматлікія нацюрморты, створаныя ў розны час. Прадстаўленыя на выстаўцы работы педкупляюць гармоніяй фарбаў і святла, цікавымі кампазіцыйнымі рашэннямі.

Яўгеній Усеваладавіч Валабуеў — мастак асаблівага плана. Яго пейзажы, нацюрморты, жанравыя сцэны прасякнуты тонкім лірызмам, у іх б'ецца жывая неспакойная думка. Бадай, асноўнае месца ў яго творчасці займае нацюрморт, звязаны з пейзажам. Калі, напрыклад, у карцінах Яблонскай асноўнае — чалавек, а пейзаж служыць акружэннем, то Валабуеў наадварот, бярэ за аснову пейзаж і ўводзіць у яго людзей, жывёл або нацюрморт — як элементы агульнага рашэння. Асаблівую ўвагу ён аддае колеру, як правіла, падначаленаму агульнай танальнасці. Так, карціна «Двое» не вылучаецца яркасцю фарбаў. Мастак напісаў яе ў стрыманых тонах, але твары, позы — перадаюць унутранае напружанне, а колер нібы падкрэслівае канфліктнасць сітуацыі.

Доўга працаваў мастак над карцінай «Певень, конь, сонца», стварыў мноства варыянтаў — кампазіцыйных і каляровых. У прадстаўленым на выстаўцы варыянце адчуваюцца рысы казачнасці, блізкія да матываў гогалеўскіх «Вечароў на хутары каля Дзіканькі».

Даволі вялікі раздзел выстаўкі складае графіка Георгія Якутовіча. У экспазіцыі трыццаць тры яго работы. У ліку іх серыя ілюстрацый да аповесці М. Кацюбінскага «Цені забытых продкаў». Гэтая казачна - фантастычная і разам з тым зусім рэальная аповесць аб жыцці гуцулаў літаральна завалодала ўяўленнем мастака. Невыпадкова ён удзельнічаў у стварэнні фільма «Цені забытых продкаў».

Веданне гісторыі Гуцульшчыны, яе мастацтва, жыцця людзей дапамаглі мастаку ў рашэнні складаных тэмы і вызначэнні стылявых асаблівасцей графічных лістоў.

Своеасаблівыя і ілюстрацыі да кнігі М. Прыгары «Думы пра казака Галоту» (асабліва лісты «Бітва казакаў з туркамі» і «Казацкі лагер»).

Выстаўка, зразумела, не дае дастаткова шырокага ўяўлення аб сучасным мастацтве Украіны, але яна і не ставіць перад сабой такой мэты. Гэта пачатак абмену думкамі, які будзе працоўжаны. Хочацца спадзявацца, што выстаўка выкліча такую ж цікавасць, якой мы чакаем ад выстаўкі беларускіх мастакоў у Львове.

Марына ТУРОЎСКАЯ.

Фотаэцюд Н. АМЕЛЬЧАНКІ.

ГОСЦІ МІНСКА

СПЯВАЕ ЮЛІЯ БУЧУЧАНУ

Юлія Бучучану ў ролі Азучэны ў спектаклі «Трубадур».

У апошнія гады румынская вакальная школа атрымала вялікае прызнанне, а такія оперныя спевакі, як барытоны Нікалае Херля і Ладзіслаў Коніа, тэнар Іон Пісо, сапрана Арта Флярэску і іншыя неаднаразова дэманстравалі сваё майстэрства ў многіх буйнейшых тэатрах свету.

Мы ў Мінску таксама слухалі некаторых румынскіх майстроў вакалу. Слухалі Нікалае Херля, аднаго з лепшых сучасных барытонаў свету, Дана Іярдакеску, выдатнага камернага спевака, лаўрэата дзевяці міжнародных конкурсаў.

На гэты раз да нас у Мінск прыехала салістка Бухарэсцкай оперы Юлія Бучучану. Яна выконвае ў Мінску партыі Азучэны ў оперы «Трубадур» і Амнерыс у оперы «Аіда».

Азучэна... Цэнтральнае месца ў яе характарыстыцы займае першая карціна другой дзеі — адзін з лепшых эпізодаў у оперы.

Горы Біскайі. Ноч. Цыганскі табар. Ля кастра сядзіць сівая цыганка. Полымя кастра абуджае ў ёй жахлівыя ўспаміны дваццацігадовай даўнасці. Хор спявае сваю жыццярадасную інтрадукцыю «Что может быть нам милее и краше красотки нашей». І раптам песня Азучэны. «Пламя, взвиваясь, все озаряет»... Нават не ведаючы мовы (Ю. Бучучану спявае парумынску) і зместу оперы, можна здагадацца, што спявачка аб нечым жахлівым, настолькі шчырыя і праўдзівыя інтанацыі спявачкі. Здаецца, так і бачыш полымя, на якім спалілі яе старую маці, абвінавачаную інквізіцыяй у вядзьмарстве.

Вібрата голасу спявачкі настолькі ўсхваляванае, што міжволі перадаецца слухачам і выклікае адпаведную рэакцыю ў зале.

У Ю. Бучучану шчыльнае і аб'ёмнае меца-сапрана, амаль кантр-альтавага гучання. Яна шчырая і праўдзівая ў сцэнічных паводзінах—кожны жэст спявачкі апраўданы станам гераіні.

Зусім іншага характару партыя Амнерыс з оперы «Аіда». І ў ёй спявачка цалкам раскрыла свае багатыя выканаўчыя магчымасці.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ.

КІРМАШ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Я, здаецца, магу табе крыху дапамагчы, Васіль. Алесь Карповіч, інжынер,—помніш, сядзеў на Лукішках,—абяцаў мяне ўладкаваць. Папрашу заадно для цябе. Ён чалавек памяркоўны, не адмовіць, паможа замаскавацца. А гэта цяпер самае галоўнае. Іх палітыка—вынішчыць самых актыўных, запалохаць народ, каб потым панукаць перапуджанымі людзьмі, як быдлам. Гэта д'ябальская тактыка.—Валянцін змоўк, засяроджана пра нешта думаючы. Потым глянуў на Васіля і загаварыў настойліва:

— Слухай, Васіль. Ты ж тутэйшы, шмат людзей нашых ведаеш. Усіх не знішчылі. Мы жывыя, значыць, ёсць і яшчэ. Трэба дзейнічаць. Даведацца пра настрої і згуртоўвацца паціху. Сувязі трэба ладзіць. Яны нам—як паветра... Асабліва з тымі, што маюць вопыт. Але, вядома, вельмі, вельмі асцярожна. На ражон не трэба лезці.

— Гэта так. Засталося нашых, вядома, Чаму ж. Вось у Падкасоўі мая сястра замужам. Да яе збіраюся ісці. Там ёсць некалькі хлопцаў-дружбакоў...

— Добра. Пакуль Алесь тут будзе тое-сёе рабіць для нас... схадзі ты. Справа вартая. І пільная. Справа лёсу. Не нашага з табою, а ўсіх чэсных людзей. Ведаеш, які дэвіз фашысты маюць: «Хто не зможа зарганізавацца супраць нас—той будзе з намі». Так што мы не толькі замаскіруемся, а павінны гуртавацца і дзейнічаць як мага хутчэй. Але як пойдзем да Карповіча, пра нашы намеры нічога не гаварыць. Не трэба яго страшыць. Ты ў яго ніколі не быў?

—Не даводзілася.

— Дык уліч, жонка яго вельмі набожная. Здаецца, ці не ў манашкі калісь збіралася. Глядзі, каб не абразіць пачуццяў. Ну, а сам Алесь, як і быў,—свой чалавек. Толькі напалоханы ўсім. Ён па натуры каржэтны, мяккі, дык тут добра з людзьмі жыве. Нават з тымі, хто на вялікія пасады забраўся. Гэта трэба мець на ўвазе. А ў наступную нядзелю пабачымся. Прыходзь проста да яго. Я з ім пагутару наконт цябе, папярэджу. Слонімская вуліца. Сорак пяты нумар.

Можна было б і разысціся, але Валянцін бачыў, што Васіль хоча яшчэ нешта сказаць, а мо вызнаць нешта, ды не рашаецца. Валянцін закурыў ужо на адыход. Павагаўшыся, Васіль загаварыў, гледзячы некуды ўбок:

— Ну, чаму ж так сталася? Растлумач, брэце, ты ж такі болей вучоны. Так жа верылі... А выйшла самахвальства ці што: мы разаб'ём любога ворага на яго тэрыторыі... І нас, капазбоўцаў, не лічылі камуністамі. А немцы вунь лічаць—знішчаюць... Горка, братко, усё такое, як падумаеш, да слёз горка і абідна. Так іншы раз абідна, што хоць на сябе рукі налажы. На чым мы ў падполлі трымаліся? На чэснасці. І верылі сваім...

Заморгалі, памакрэлі васілёвыя вочы-сіроткі. Здавалася, што ён вось-вось расплачацца. Валянцін улучыў паўзу ў гаворцы і прамовіў як мага спакайней:

— У ходзе вайны ўсе стане на месца. Перамагчы такога ворага без даверу нельга. Ты ж чуў Сталіна па радыё? Звяртаўся да народа.

— Дзе мне чуць. У нас паліцыя ўсе радыё пабрала.

— А я слухаў. У Скрыбаве, у бацькі. Аказваецца, ужо ёсць шмат партызанскіх атрадаў...

— Дай бог, каб тое, што ты кажаш, не было толькі нашым хаценнем.

— Гэта браце, хаценне агульнае: і наша і ўсіх чэсных людзей, усяго народа і партыі. Такія хаценні збываюцца. Нават гэта не хаценні, а жалезны закон жыцця. Вораг дэмагогію сее—ад калгасаў, маўляў, вызвалім, ад паставак, ад жыдоў... Трэба выкрываць дэмагогію. Бярэ пастаўкі не толькі зернем, не толькі жывёлай—а людзьмі, крою людскою. Яўрэямі расчынілі, а беларусамі, славянамі замеяць гэта цеста. Вось што трэ гаварыць. Толькі адзін на адзін, па даверу. А слова перадасца. Народ прагны праўдзівага слова.

— Яно, пэўне, так... А хіба я не кажу слова? Мо не так хлёстка, але сваім кажу.

Васіль уздыхнуў. Пачаў распытваць Таўлая пра яго вершы. Каб не даваць новага повада для прыкрых развар, Валянцін не расказаў яму пра сваю незваротную страту. Сказаў, што вершы ў надзейным месцы.

— Скончыцца вайна, дастану і надрукую. А мо і раней надрукуем... Як пастараемся з табою, Васіль!..

— Ты, братко, духам цвёрды, хоць і ціхі. Добра з табою. Як вады жывое наліўся. Аж расставацца не хочацца. Так бы і сядзеў тут... Ну, яшчэ пра адно спытаю. Як жа яна, жонка твая? Што? Дзе? Баяўся пытацца, але бачу, што ты не паў духам, дык думаю, давай спытаю...

— Жывая. Жывая... У сваіх людзей.

Валянцін запэўніў сябра, а сам адчуў, як пахаладзела ўсё ўнутры. Перавёў позірк удаль, і само вырвалася, ужо менш упэўнена:

— Веру, што жыве і выжыве.

— Я рады, што хоць так... Не буду выпытваць, дзе і што. Бо ў такіх справах ведаць зашмат нікому не трэба. Мы, старыя падпольшчыкі, сабаку, як кажуць, на канспірацыі з'елі, і не адну.

— Давай дамовімся, што гэтая наша сустрэча і размова—пачатак новага падполля. Згодзен?

— Пэўне. Даю руку—во!..

КОНКУРС БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЯ

Беларускае радыё і тэлебачанне аб'яўляюць конкурс на лепшы твор, прысвечаны жыццю і шматгранай дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна, барацьбе Камуністычнай партыі і савецкага народа за ажыццяўленне вялікіх ленінскіх ідэй.

На конкурс могуць быць дасланы сцэнарыі тэлевізійных фільмаў і спектакляў, радыёп'есы, сцэнарыі тэматычных тэлевізійных перадач, апавяданні, нарысы, песні (тэксты і музыка).

Запрашаем пісьменнікаў, журналістаў, рабочых, калгаснікаў, студэнтаў — усіх жадаючых прыняць удзел у конкурсе.

За лепшыя творы, што паступяць на конкурс, акрамя ганарару, устаноўлены прэміі:

ЗА СЦЭНАРЫЙ ТЭЛЕВІЗІЙНАГА ФІЛЬМА, СПЕКТАКЛЯ

Першая прэмія — 700 рублёў,
дзве другія прэміі — па 400 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 300 рублёў.

ЗА РАДЫЁП'ЕСУ

Першая прэмія — 600 рублёў,
дзве другія прэміі — па 350 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 250 рублёў.

ЗА СЦЭНАРЫЙ ТЭМАТЫЧНАЙ ТЭЛЕВІЗІЙНАЙ ПЕРАДАЧЫ

Першая прэмія — 250 рублёў,
дзве другія прэміі — па 200 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 150 рублёў.

ЗА АПАВЯДАННЕ

Першая прэмія — 200 рублёў,
дзве другія прэміі — па 150 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 100 рублёў.

ЗА НАРЫС

Першая прэмія — 200 рублёў,
дзве другія прэміі — па 150 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 100 рублёў.

ЗА ПЕСНЮ (ТЭКСТ)

Першая прэмія — 200 рублёў,
дзве другія прэміі — па 150 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 100 рублёў.

ЗА ПЕСНЮ (МУЗЫКА)

Першая прэмія — 200 рублёў,
дзве другія прэміі — па 150 рублёў,
дзве трэція прэміі — па 100 рублёў.

Матэрыялы дасылайце на адрас: Мінск, Красная, 4, Дом радыё, і Мінск, Камуністычная, 6, Беларускае тэлебачанне.

Апошні тэрмін падачы матэрыялаў на конкурс — снежань 1969 года.

Вынікі конкурсу будуць падведзены ў красавіку 1970 года.

Дзяржаўны Камітэт Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанні і тэлебачанні.

З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

АНГЛІЧАНЕ СМЯЮЦЦА

Настаўніца:
— Вам трэба было напісаць сачыненне пра харчы на пяці старонках, а ты напісаў толькі адну.
Вучань:
— Так, мэм, але ж я пісаў пра згушчонае малако.

□

Настаўніца нядзельнай школы спытала:
— Хто вывеў дзяцей Ізраіля з Егіпта?
У адказ — маўчанне. Тады настаўніца падняла хлопчыка з першай парты.
— Гэта не я, міс. Мы нядаўна прыехалі сюды з Кастля.

□

У кабінет урача зайшоў мужчына з заклапочаным тварам.
— Доктар, — пачаў ён, — я жыву ў сваёй цешчы. Яна вельмі клапатлівая і ўважлівая. Я вельмі яе паважаю, лічу цудоўнай жанчынай.
— Дык у чым жа справа?
— Скажыце, доктар, я нармальны?

□

Жонка:
— Ало, гэта бюро пошукаў? У мяне прапаў муж. Вы не можаце дапамагчы?
Начальнік бюро:
— Канечне, мадам. Апішыце яго, калі ласка.
Жонка:
— Ён невысокага росту, тоўсты, лысы, увівецца каля бландынак, амаль ніколі не бывае цвярозы, у яго сіпаты голас і... Ліха з ім, зніміце заказ!

□

— Я зусім упэўнены, — гаворыць псіхіятр кліенту, — што мы вас вылечым ад клептаманіі.
Узрадаваны кліент горача дзякуе доктару і збіраецца выходзіць з кабінета.
— Адну хвілінку, — спыняе яго доктар. — У выпадку, калі ў вас здарыцца рэцыдыў, вы не змаглі б прыхапіць для мяне транзістарны прыёмнік?

□

Энергічная лэдзі сваёй хатняй работніцы:
— Сёння панядзелак ужо, заўтра будзе аўторак, паслязаўтра серада. Паўтыдня мінула, а ты яшчэ нічога не зрабіла.

□

— О, божа, у нас зусім не засталося грошай, — гаворыць муж.— Я проста не ведаю, які рахунак аплачваць: урачу ці электрычнай кампаніі.
— Вядома, электрычнай кампаніі, — адказала жонка. — Не стане ж доктар перапразаць нашы артэрыі.

□

— Калі я сварыся са сваёй жонкай, то хваліўся адзін мужчына другому, — апошняе слова застаецца за мной.
— Няўжо? — здзіўляецца яго сябра. — Якое ж гэта слова?
— Прабач, дарагая.

Пераклад з англійскай мовы
Р. БРАГІНА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 лютага

Першая праграма 9-10 — тэлебачанне — школе. Грамадазнаўства. 10-ы клас. «Праца і размеркаванне прыбытку ў сацыялізме». 9-40—«Валянцёры рэвалюцыі». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15—«Табе, юнацтва!» «Першы галоўнакамандуючы». Трансляцыя на Маскву. 10-45—фестываль фільмаў саюзных рэспублік. «Зямля бацькоў». Мастацкі фільм (М). 12-15—для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Цуды прыроды» (М). 12-30—навукова-тэхнічны прагрэс. «Вынаходнік». Тэлевізійны часопіс (М). 16-15—праграма перадач. 16-20—тэлевізійныя навіны (М). 16-30 — для малодшых школьнікаў. Тэатр «Званочак» (М). 17-00—«Масква — Сафія». Музычная праграма (М). 18-00—да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. «Падзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 18-30—насустрач выбарам у мясцовыя Саветы БССР. «Тэлевізійны агітпункт». 18-50—«Панарама навін». 19-20—для моладзі. «Дарогай бацькоў-герояў». 20-00—«Эстафета навін» (М). 20-45—«Экран збірае сяброў». Канцэрт. Перадача з Кіева. 21-45—літаратурны тэатр. І. Ільф і Я. Пятроў. «Аднапавярховая Амерыка» Прэм'ера публіцыстычнага сатырычнага спектакля (М). 22-45—«Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1946-ы». 23-20—«Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма 18-30 — опера С. Пракоф'ева «Сямён Катко». Прэм'ера тэлевізійнага музычнага фільма (М). 20-00—«Майстры мастацкага слова». Сучасная савецкая паэзія. Чытае І. Фёдарава. 20-40—спартыўная перадача. 22-25—да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. «Старонкі Сталінградскай бітвы». Фільм пяты. «Разгром Манштэйна» (М). 22-45—«Рэха спартыўнага свету» (М).

22 лютага

Першая праграма 8-25—праграма перадач. 8-30—для студэнтаў тэхнікумаў. «Супраціўленне матэрыялаў». 9-00—«Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00—музычная вясёлая праграма (М). 10-30—«Чалавек зямлі маёй». Расказ пра начальніка змены Бабруйскага гарадскога вузла сувязі Героя Сацыялістычнай Працы В. А. Гардзееву. 10-50—«Візіт дружбы». У тэлевізійным рабочым клубе сустракаюцца аўтатранспартнікі Беларусі і Прыбалтыкі. 13-00—«Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 13-30—да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. «Дзеля жыцця на зямлі». Тэлевізійны дакументальны фільм (М). 14-00—«Старонкі любімых кніг на экране». «Школа мужнасці». Мастацкі фільм (М). 15-35—«Стваральнікі». «Мой завод—мая сям'я». Перадача з Ленінграда. 18-00—«Музычная шкатулка». 18-20—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Звязда». Тэлевізійны часопіс. 19-30—тэлевізійныя навіны (М). 19-45—«КВЗ-69» (М). 21-30 — «Свет сацыялізму». Міжнародная праграма (М). 22-00 — «На агеньчык» (М). 23-00 — «Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма 10-30—«На старт». Спартыўная пераключа гарадоў (М). 18-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 19-30—канцэрт. 21-30 — да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. «Старонкі Сталінградскай бітвы». Фільм шосты. «Кальцо сціскаецца». 22-00 — «Чакай мяне». Мастацкі фільм.

23 лютага

Першая праграма 8-25—праграма перадач. 8-30—для студэнтаў тэхнікумаў. «Электратэхніка». 9-00—«На зарадзьe станавіся!» (М). 9-15—тэлевізійныя навіны (М). 9-30—«Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — для школьнікаў. Канцэртная зала «Арфей». Опера-казка С. Пракоф'ева «Пеця і воўк». 11-00—для юнацтва. «Навука перамагаць». II тур алімпіяды па гісторыі ваеннай тэхнікі (М). 12-00—да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. «На варце міру». Рэпартаж (М). 13-00—«Сельская гадзіна» (М). 14-00—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Салдатамі не нараджаюцца» (М). 14-40—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 15-00—першынство СССР па хакеі. «Спартак» (М) — ЦСКА (М). 17-15—праграма каляровага тэлебачання. 1. Клуб кінападарожнікаў. 2. «Поплеч». Сустрэча з артыстамі Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі (М). 19-30—святочны канцэрт (М). 20-40—«Навіны дня» (М). 20-50—«Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 21-40—«Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка». Мастацкі фільм (М). 23-00—«Спартыўны тыдзень» (М). 23-15—праграма перадач.

Другая праграма 10-30—«Рускі партрэт і касцюм XVIII стагоддзя». Перадача з Ленінграда. 11-00—для дзяцей. «Казка пра Хлапчыша-Кібальчыша». Мастацкі фільм. 14-30—спартыўная перадача. 18.40 — «Дык няхай жа Чырвоная» Кінанарыс. 19-00—«Старонкі Сталінградскай бітвы». Фільм сёмы. «Перамога». 19.30—«Шчыт і меч». Спектакль Рускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. 21-50—«Спявае Тамара Ханум». Фільм-канцэрт.

КУТОК КАЛЕКЦЫЯНЕРА

НА МАРЦЫ—ВОІН-ПЕРАМОЖЦА

Савецкім Узброеным Сілам прысвечана шмат паштовых марак. Яны нагадваюць аб легендарных подзвігах салдат, слаўных палкаводцаў Савецкай Арміі, аб героях, навечна занесеных у спісы часцей, аб рашаючых бітвах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Гераічная Савецкая Армія ўслаўлена не толькі нашымі майстрамі паштовай мініяцюры. Не раз да гэтай высакароднай тэмы звярталіся і мастакі зарубежных краін.

У 1955 годзе ў ГДР была выпушчана марка ў гонар Дня вызвалення. Выканаў яе вядомы мініяцюрыст К. Эйглер. У цэнтры знака — мемарыяльны помнік савецкім воінам у берлінскім Трэптаў-парку. Гэтая нямецкая марка ўпрыгожыла вокладкі часопісаў, блакнотаў, школьных сшыткаў, разышлася па свеце на тысячах пісьмаў.

Многа марак, прысвечаных Савецкай Арміі, выдадзена ў Балгарыі. Першая з іх была выпушчана ў 1948 годзе. На ёй — на фоне зоркі — савецкі аўтаматчык. Два паштовыя знакі балгары прысвяцілі маршалу Талбухіну, які камандаваў савецкімі войскамі, што вызвалялі Балгарыю ад фашысцкага ярма.

На многіх польскіх марках — помнікі, узведзеныя ў гонар змагавання крывёю дружбы савецкіх і польскіх воінаў. Некалькі паштовых знакаў прысвечана баям пад Леніна на Магілёўшчыне, дзе пры братняй падтрымцы Савецкай Арміі нарадзілася народнае Войска Польскае.

Вобраз гераічнага савецкага танкіста не раз паяўляўся на паштовых знаках Чэхаславакіі. Ён, у прыватнасці, увасоблены на марках, прысвечаных пяцігоддзю з дня вызвалення краіны Савецкай Арміяй. Адна з марак паказвае савецкага салдата, які дапамагае вязню фашысцкага лагера, вырванаму з кіпцюроў смерці. На другой — наш воін прыціскае да грудзей чэшскую дзяўчынку з палявымі кветкамі.

Некалькі цікавых марак, прысвечаных вызваленню братніх краін ад гітлераўскіх захопнікаў, выпусціла Міністэрства сувязі СССР. Так, у 1965 годзе ў сувязі з 20-годдзем Венгерскай Народнай Рэспублікі выйшла марка з малюнкам славутага помніка на гары Гелерт у Будапешце. Аўтар манумента скульптар Кішфалудзі-Штробль вылепіў сярод іншых і фігуру савецкага воіна са сцягам у руцэ. Пазіраваў яму адзін з нашых байцоў — нехта Васіль. Праз 20 гадоў удалося знайсці былога салдата ў Іванаўскай вобласці. У дні свята ў Венгрыі сустрэліся славуты скульптар і Васіль Галаўцоў.

У азнаменаванне дваццацігоддзя перамогі над фашысцкай Германіяй выйшлі юбілейныя мініяцюры ў гонар вызвалення Бялграда і Варшавы. На адной з марак, на фоне панарамы польскай сталіцы намаляваны медаль, якім узнагароджаны сотні тысяч савецкіх воінаў, што ўдзельнічалі ў вызваленні шматпакутнай Варшавы.

Маркі з гордай постаццю воіна-пераможцы, воіна з чырвонай зоркай на шапцы. Сабраныя на лістах філатэлістычных альбомаў, яны складаюцца ў хвалюючую дакументальную аповесць аб мужнасці, гераізме і славе.

Л. КОЛАСАЎ,
адказны сакратар Беларускага рэспубліканскага аддзялення Усесаюзнага таварыства філатэлістаў.

НОВЫЯ РАБОТЫ МАСТАКОЎ



В. ДАНЕНКАЎ. «СЯСТРА НЕМАНА — ВІЛІЯ» (медзь, чаканка).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда».

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023